Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 228 (5071)
КАСТРЫЧНІКА
23
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Прасачыць за тым, каб хлеб, атрымліваемы калгасамі за зданы па кантрактацыі лён і лён, які застаўся ў калгасах пасля выканання плана здачы, размяркоўваліся па працаднях паміж калгаснікамі, якія працавалі на пасеве, уборцы, апрацоўцы і вывазцы ільну“

(З пастановы СНК БССР ад 8 жніўня 1934 г.)

БАЛБАТУНЫ ЛЯ РУЛЯ РАЕННАГА КІРАЎНІЦТВА

Ці ў адной з правадзімых кампаній не было яшчэ такой **стракатасці** ў ходзе выканання плана, як у ільнозагатоўках. Калі мы прааналізуем зводку на 15-X, то ўбачым, што побач з Аршанскім ільнаводчым раёнам, выканаўшым план на **75,2** проц., Нараўлянскі, Рэчыцкі і інш. выканалі план менш чым на **3** проц., што побач з Сенненскім ільнаводчым раёнам, выканаўшым план на **76,9** проц., ёсць такія ільнаводчыя раёны, як Бялынніцкі, які выканаў план на 11 проц., Дуброўенскі — на 4,7 проц.

Аб чым гаворыць гэта стракатасць? Яна з'яўляецца самым наглядным доказам таго, што прычыны поспехаў адных і ганебнага таптання другіх трэба шукаць у **кіраўніцтве.** Умовы ільнозагатовак амаль ва ўсіх раёнах аднолькавыя. Стракатасць у ільнозагатоўках гаворыць аб тым, што ў адных раёнах калгасамі кіруюць большэвікі, у другіх — «чэсныя балбатуны».

Ільнозагатоўкі — сур'ёзнейшы экзамен для кожнага раённага кіраўніцтва. Апрацоўка ільну патрабуе максімальна канкрэтнага, аператыўнага кіраўніцтва, ведання агратэхнікі. Вынось сотні заклінанняў-рэзалюцый, але калі ты, раённы кіраўнік, не ведаеш, як трэба сушыць, мяць, трапаць лён, якія агратэхнічныя мерапрыемствы трэба прымяняць, каб атрымаць **высокі** ўмар валакна, — твой раён зласць дрэнную прадукцыю дзяржаве.

На ільнозагатоўках выразней за ўсё выяўляецца стыль таго ці іншага раённага кіраўніцтва. Балбатуны адразу выплываюць наверх. Возьмем для прыкладу **Бялынічы.** Як вядома, раён ужо рад пяцідзённак знаходзіцца на чорнай дошцы. У рашэнні ЦК КП(б)Б і СНК БССР сакратару РК КП(б)Б т. Рымша і старшыні РВК т. Сукала, (начпалітаддзелам МТС у Бялынічах працуе тав. Беленькі) была вынесена вымова.

Ці ўлічыла ўсе гэтыя папярэджанні і ўказанні бялынніцкае кіраўніцтва? Абсалютна не. Магчыма ў Бялынічах невядомы мера прыемствы, якія забяспечваюць большэвіцкія тэмпы і якасць апрацоўкі і здачы ільну? Але ЦК і СНК яшчэ ў жніўні (гл. «Звязду» ад 12-VIII), далі дэтальныя, разгорнутыя ўказанні. У чым-жа справа? Ды ў тым, што ў Бялынічах ля руля раённага кіраўніцтва знаходзяцца балбатуны. Гэта наглядна паказвае змешчаная сёння карэспандэнцыя з Бялынич. І сапраўды. Што значыць выносіць шматпажаданыя рэзалюцыі аб ільнопрацоўцы і дапускаць, каб значная частка калгасаў у **кастрычніку** яшчэ не прыступала да апрацоўкі ільну. Выносіць рэзалюцыі-заклінанні і дапускаць, каб многія калгасы выдзелілі толькі 10 проц. рабочай сілы на лён. Як кваліфікаваць тое кіраўніцтва, якое выносіць сажнёвыя рэзалюцыі, лае ўсе сельсоветы і партарганізацыі (аб сабе скромна замоўчвае), дапускае такое становішча, каб хлеб, прызнаны для стымулявання ільнозагатовак, ляжаў на складах заготільна пад носам у РК, РВК, палітаддзела і не арганізуе растлумачэння калгаснікам важнейшага закона аб налічэнні 2 працадзён за выкананне дзённай нормы на ільнопрацоўцы? Як кваліфікаваць тых кіраўнікоў з РК, РВК, палітаддзела, якія ўзыўаюць (у рэзалюцыях) да пачуцця адказнасці старшыні сельсовета, калгаса, але не ўдасужыліся забяспечыць вылучэнне ў калгасах спецыяльных адказных па ільну, не зрабілі здабыткам кожнага сушыльшчыка, мяльшчыка, трапальшчыцы асноўныя агратэхнічныя правілы апрацоўкі ільну? **Такіх кіраўнікоў іншых, як балбатунамі, назваць нельга.** Бліжэйшыя дні пакажуць, ці здолеюць бялынніцкае кіраўніцтва (і кіраўніцтва другіх, ганебна зрывалых ільнозагатоўкі раёнаў) **рашуча перабудавацца,** ці к такому кіраўніцтву трэба будзе прымяняць указанне тав. Сталіна: «калі іх (балбатуноў. — Рэд.) пакінуць на аператыўнай рабоце, яны здольны патапіць любую жывую справу ў патоку бязгаліцтых і нескончаемых прамоў. Відавочна, што іх трэба знімаць з кіруючых пастоў і ставіць на іншую, не аператыўную работу. Балбатунам не месца на аператыўнай рабоце».

ДАСТОЙНА СУСТРЭЦЬ ОКЦЯБРСКУЮ ГАДАВІНУ

Выступленне сакратара ЦК КП(б)Б тав. Н. Ф. ГІКАЛО на сходзе партактыва, камандзіруемага ЦК у раёны для завяршэння сельска-гаспадарчых работ

21 кастрычніка ў ЦК КП(б)Б адбылася нарада таварышоў, якія камандзіруюцца ЦК у раёны для дапамогі ў завяршэнні сельскагаспадарчых кампаній. На нарадзе выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Н. Ф. Гікало,** зрабіўшы грунтоўны інструкцыйны даклад.

У пачатку свайго даклада таз. Гікало ўказаў, што калі веснавыя і летнія сельскагаспадарчыя работы ў гэтым годзе па Беларусі праведзены значна раней і лепш, чым у мінулым годзе, то ў асенніх кампаніях мы маем сур'ёзнае адставанне, прымушаючае Бюро ЦК КП(б)Б прызнаць іх ход незадавальняючым.

Тав. Гікало даў разгорнуты аналіз асобных галін работы на сяле.

Па БССР на 15 кастрычніка было абмалочана ўсяго 81 проц. зерневых. Зацягванне абмалоту затрымлівае размеркаванне ўраджаю ў калгасах, выклікае папрокі калгаснікаў і нават мясцамі нездаровыя настроі.

— У гэтым, — гаворыць тав. Гікало, — мы вінаваты самі. У калгасах, якія даўно ўжо выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай, даўно ўжо трэба было абмеркаваць пытанні размеркавання даходаў. Зацяжка гэтага толькі шкодзіць справе.

Агрэгаманднейшае значэнне для павышэння ўраджайнасці і для найлепшага правядзення веснавой сяўбы мае зяблівае ворыва. Гэта зразумела кожнаму. А між тым, план зяблівага выканан толькі на 71 проц. Адсюль выцякае істотная неабходнасць падцягнуць гэты ўчастак.

Указаўшы, што па БССР яшчэ не ўбрана 5 проц. бульбы і што завяршэнне капання бульбы не церпіць адкладанняў ні на адзін дзень, тав. Гікало пераходзіць да пытанняў дзяржаўных паставак і загатовак. Ён адзначае, што выкананне на 15 кастрычніка 79.5 проц. бульбапаставак ні ў якой меры не можа лічыцца здавальняючым.

— Мы ў ЦК дагаварыліся, што выканаем бульбапастаўкі раней усіх іншых рэспублік і абласцей. Мы маем для гэтага ўсе магчымасці і абавязаны гэтага дасягнуць, бо Беларусь з'яўляецца асноўным бульбяным раёнам. Апрача таго трэба ўлічыць, што затрымка з бульбапастаўкамі выкліча рад дадатковых затрудненняў: пагода становіцца ўжо нястойлівай, дарога псуецца, прыходзіцца клапаціцца аб захаванні бульбы ад дажджу і марозу, прыходзіцца ацяпляць вагоны і т. д.

Па **мясапастаўках** мы маем 71 проц. выканання. ЦК і ўрад прынялі рад мер, якія забяспечваюць поўнае выкананне абавязацельстваў. Аднак, самацёкам нічога не пойдзе — трэба справу арганізаваць, прасачыць за выкананнем дырэктыў ЦК і СНК.

— Вельмі сур'ёзнае адставанне, — прадаўжае тав. Гікало, — мы маем па **ільнозагатоўках.** У сярэднім па рэспубліцы выкананя каля 30 проц. плана і да таго мы маем 24 адстаючых раёны, якія ідуць нізкай сярэдне-рэспубліканскага ўзроўню. І вось гэтыя 24 раёны, пры агульным выкананні менш адной трэці плана, высоўваюць перад намі вельмі сур'ёзную задачу—пакончыць з падобным адставаннем. Калі раней мы мелі адстаючых раёнаў 15-16, то зараз, калі мы павінны былі-б ужо канчаць ільнозагатоўкі, у нас такіх раёнаў 24. Гэта вельмі сур'ёзная небяспека.

Вельмі востра ставіць тав. Гікало пытанне аб памольным зборы. Восень з'яўляецца рашаючым перыядам у гэтай справе. Восенню, апрача вялікіх механізаваных ільнаў, працуюць вадзяныя, ветраныя і іншыя дробныя млыны; увосень, нарэшце, больш за ўсё прывозяць зярна малоць. 20 проц. выканання плана памольнага збору — гэта сведчанне выключна дрэннай работы.

Затым тав. Гікало пераходзіць да пытанняў **закупкі хлеба.**

—Па закупцы хлеба,—гаворыць ён, — у пачатку работы мы стаялі на другім месцы па Саюзу, праз пяць дзён апынуліся па трэцім, праз некаторы час — на дзевятым. А цяпер, пры закупцы 50 проц. намечанай колькасці, мы займаем толькі 16-е або 15-е месца. Пры гэтым трэба ўлічыць, што ў раёнах у радзе выпадкаў запосяць у зводку, як ужо закуплены хлеб, і тую частку, на якую заключаны дагаворы, але якая на склады яшчэ не паступіла. Як відаць, тут мы яшчэ недастаткова сочым.

Такім чынам, па закупках хлеба мы значна адстаем. А вы ведаеце, што хлебазакупкі палітычна вельмі вялікая, важная справа. ЦК ВКП(б) і СНК СССР папярэджвалі, што яны будуць распэньваць работу арганізацый — рэспубліканскіх, абласных, раённых, усіх арганізацый у вогуле — па тым, як яны змагаюцца за закупку хлеба. У адносінах хлебазакупак справа ставіцца таксама, як стаяла яна ў адносінах хлебапаставак. А ў нас асталіся яшчэ «хвосцікі» нават па хлебапастаўках. У нас у Беларусі да гэтага часу 600 калгасаў не выканалі абавязацельстваў па пастаўках зярна. Па аднаасобнаму сектару недавыкананне дасягае 8 проц. Мейце на ўвазе, што гэтыя 600 калгасаў і плюс да іх частка аднаасобных гаспадарак, якія ўсё яшчэ астаюцца ў даўгу перад дзяржавай, ствараюць нам сур'ёзныя труднасці. Мы не можам дапусціць, каб дзяржаўнае абавязацельства не было выканана хоць-бы адной гаспадаркай. Калі дадаць да гэтага адставанне па асобных заданнях, то мы ўбачым, што гэтыя адстаючыя гаспадаркі, калгасы, сельсоветы, раёны зніжаюць як гаспадарчы эфект праводзімых кампаній, так і агульна-палітычную карціну на сяле.

Падрабязна тав. Гікало спыняецца на задачах перавыбараў советаў, якія павінны зараз праводзіцца. Гэта адна з важнейшых кампаній, у якой гутарка ідзе аб дыктатуры пролетарыята, аб прыцягненні да кіраўніцтва дзяржавай мільённых працоўных мас. Аднак, сапраўднага разгортвання кампаніі мы яшчэ не маем. Чаму? Сядзіць вось у нас раённык — а лён у яго не выканан, закупкі хлеба незакончаны, па хлебапастаўках ён мае «хвосцікі». Вось гэтыя «хвосцікі» (а мясцамі нават «хвасцішчы») і адцягваюць яго ўвагу, затрымліваюць яго сілы і ён не пераключаецца на перавыбары советаў. А каб спалучыць гэтыя задачы, каб разгортваннем перавыбарчай кампаніі падцягнуць іншыя ўчасткі, — аб гэтым ён не здагадваецца.

Гэтым мы, па-першае, зніжаем работу па перавыбарах советаў, а па-другое, не зможам дастойна адсвяткаваць Окцябрскія дні. На самой справе, якое-ж гэта будзе свята, калі мы ведаем, што адстаем. Справай нашага гонару павінна быць ліквідацыя ўсякіх «хвастоў» і «хвосцікаў» да 1 лістапада.

Гэта выцягванне з адставання неабходна паставіць у цесную сувязь з перавыбарамі советаў. А ў нас у радзе выпадкаў адчуваюцца нейкія дзяліцкія адносіны да перавыбараў. У радзе раёнаў няма таго, каб асноўныя кіруючыя работнікі выступілі па пытаннях перавыбараў, паднялі гэтыя пытанні на вялікую палітычную вышыню, мабілізавалі масы. Або вось праверка наказаў. Мы яшчэ не ўмеем правяраць выкананне наказаў, не ведаем, як яны ажыццёўлены. Трэба арганізаваць справаздачы дэпутатаў советаў і раённыя кіраўнікі павінны стаць у гэтым застрэльшчыкамі.

Масавая арганізацыя перавыбарчай кампаніі не можа не даць аграмадных палітычных вынікаў. Такая арганізацыя кампаніі выкліча палітычны ўздым і дапаможа нам ліквідаваць усякае адставанне.

— Мы маем таксама, — гаворыць далей тав. Гікало, — адставанне і па лініі калектывізацыі. Па БССР было калектывізавана 55 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зараз мы маем каля 62 проц., але ўсё яшчэ знаходзімся на адным з апошніх месц.

Праўда, мы значна ўмацавалі за апошні час нашы калгасы. 600 адстаючых калгасаў — гэта вельмі дрэнна, але ў параўнанні з мінулым 600 адстаючых з агульнай колькасці звыш дзесяці тысяч калгасаў — малюнак значна лепшы. Нашы калгасы ўмацаваліся і палітычна і гаспадарча. Гэта, зразумела, уплывае на тое, што тэмпы калектывізацыі паступова нарастаюць. Амаль ва ўсіх раёнах наглядаецца зараз сур'ёзны прыліў у калгасы.

Гэты прыліў з'яўляецца рэзультатам нашай палітычнай работы (якую трэба яшчэ палепшыць і пашырыць) і значных поспехаў нашых калгасаў (якія трэба таксама множыць і паглыбляць).

Разам з тым калгасны прыліў выклікае поўнае абвастрэнне класавай барацьбы ў вёсцы. Прадэманстраваўшы радам фактаў малюнак абвастраючайся класавай барацьбы ў вёсцы, тав. Гікало адзначае:

— Гэта гаворыць аб актыўным супраціўленні класавага ворага. Ён, наш класавы вораг, адчувае, што калектывізацыя пашыраецца, што калгасы ўмацоўваюцца, што соцыялістычныя асновы ў вёсцы ўмацаваліся і ён узмацняе свае апошнія патугі перашкаджаць нашым поспехам.

Між тым, у радзе месц у нас недаацэньваюць гэтай ускладняючайся абстаноўкі. Вось, напрыклад, у Слуцкім раёне кулакі спалілі хату комсамольца, які выступаў з заклікам прадаць лішкі хлеба дзяржаве і сам першым прадаў. Калі ж у мясцовых работнікаў запыталі, што яны зрабілі, то яны змаглі толькі адказаць: «Мы гэтаму комсамольцу адлалі былую кулацкую хату». Гэта добра, што хату далі, і, як відаць, лепшую, чым тая, што спалена, але трэба было зрабіць з гэтага кулацкага выступлення сур'ёзныя палітычныя вывады для ўсяго раёна. Трэба было мабілізаваць, падняць масы, паказаць ім тактыку класавага ворага, арганізаваць іх на добрую работу, на выкананне сваіх грамадзянскіх абавязкаў. А вось з гэтага пункту погляду ў Слуцку нічога і не зрабілі.

Тав. Гікало гаворыць далей аб слабасці палітычнай работы на мясцах, аб існуючым мясцамі самасупакаенні кіраўніцтва, аб агульным павярхоўным, несур'ёзным кіраўніцтве. Ён паказвае ў якасці прыкладу на старшыню клімавіцкага РВК, які спыняецца каля калгасаў, не вылазячы з аўтамабіля, кліча да сябе старшыню, кідае яму: «Трэба мацней націснуць» і едзе далей.

— Вось вам адносіны да работы, — гаворыць тав. Гікало. — У нас патрабуецца сур'ёзны палітычны падыход і патрабуецца дзелавая арганізацыя мас, а не такі «аб'езд» калгасаў. Трэба зразумець, што кожны сельсавет, кожны калгас мае свае жыццё, свае асаблівасці і патрабуе своеасаблівага падыходу. Не мудрасць праехацца на машыне! Ды яшчэ калі да машыны прычапіць сцяг які-небудзь, то, зразумела, народ да яе збяжыцца. Народ збяжыцца, і вось такі «лятучы» кіраўнік дасць настаўленні: націсні, моў, хлопцы. А іншыя «хлопцы» націснуць так, што палітычна ад гэтага толькі шкода атрымліваецца.

Мы маем усе магчымасці палітычна так падняць сяло, каб выйсці перадавымі сярод рэспублік Совецкага Саюза і каб святкаванне Окцябра зрабіць нашым палітычным трыумфам. А для гэтага трэба сваю работу замацаваць правільным кіраўніцтвам, правільнымі адносінамі да людзей.

Пераходзячы да пытанняў арганізацыі Окцябрскіх свят, тав. Гікало гаворыць: — Мы не можам дапусціць, каб пасля тых соцыялістычных пераўтварэнняў, пераможна праведзеных у нашай краіне, наша пролетарскае свята прайшло па-дзяліцку. За столькі год работы нашай партыі на чале і пад кіраўніцтвам тав. Сталіна мы дасягнулі таго, каб змагчы падняць мільённыя масы на дастойнае святкаванне Окцябрскай перамогі.

Правільна робяць маскоўскія большэвікі, ставячы сабе задачай так арганізаваць Окцябрскія святы, каб, па-першае, да 1 лістапада закончыць на сяле ўсе асноўныя работы гэтага года і каб, падругое, ператварыць Окцябрскія святы ў народнае свята, у тым сэнсе, каб кожная вёска, кожны горад і мястэчка вышлі на вуліцу і пагулялі па-сапраўднаму, па-совецку пагулялі, каб музыка была, і песні, і танцы. Словам, каб было весела і радасна.

Мы таксама можам так зрабіць і павінны менна так зрабіць. Для гэтага нам патрэбна падыйсці па свята без адставанняў, без «хвосцікаў», для гэтага трэба моцна ўзяцца за перавыбарчую кампанію советаў, каб на гэтай кампаніі высока падняць палітычную масавую работу.

Заключную частку сваёй прамовы тав. Гікало прысвячае пытанням арганізацыі работы выязджаючых у раёны. Ён асабліва падкрэслівае неабходнасць чулых адносін да кожнага работніка, неабходнасць растлумачыць задачу нізавому работніку, перакананць яго, не пашкадаваўшы, бадай, лішняй гадзіны на гутарку з ім, але тады ён будзе лепш працаваць. Зразумела, калі і пасля гэтага чалавек за работу не бярэцца, калі ён працаваць усё-ж не хоча, тады і ўдарыць трэба, і калі ўжо ўдараць, то моцна. Але перш за ўсё падтрымаць трэба чалавека.

— Трэба, — гаворыць тав. Гікало, — сканцэнтраваць усе сілы — і неадкладна — на адстаючых участках. Трэба і выязджаючым з Менска і ўсяму раённаму актыву засесці ў адстаючых сельсоветах, адстаючых калгасах, каб арганізаваць там справу па-большэвіцку. Мы не можам супакоіцца на апартуністычным самацёку. Трэба арганізаваць справу, мабілізаваць людзей.

— Мы вось аб ордэне Леніна гаворым часта, — адзначае тав. Гікало, — але пакуль што не атрымалі яго. І зразумела чаму: часамі мы выскакваем добра, але затое потым заседжваемся на апошніх процантах задання.

Заклік тав. Гікало да роўнамернай, большэвіцкай, моцнай, арганізаванай работы, да завалвання Беларускай рэспублікай ордэна Леніна пакрываецца гучнымі апладысментамі.

⊙

Пасля прамовы тав. Гікало начальнік Палітсектара МТС НКЗ тав. Ратнек праінфармаваў нараду, што асноўная частка апарата Палітсектара выехала ў адстаючыя МТС. Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціс паведаміў аб мабілізацыі групы комсамольскага актыва, якая ўліваецца ў брыгады, накіроўваемыя ЦК КП(б)Б.

Усе камандзіраваныя ў раёны таварышы арганізаваны ў брыгады па групах раёнаў, на чале якіх стаяць члены і кандыдаты Бюро ЦК КП(б)Б, наркомы і іншыя таварышы з цэнтральнага актыва.

ЧАМУ БЯЛЫНІЧЫ АДСТАЮЦЬ У ІЛЬНОЗАГАТОЎКАХ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Пастанова ЦК КП(б)Б аб ільнозагатоўках, дзе ўказана аб грубейшых памылках кіраўніцтва Бялынніцкага раёна, была спаткана ў Бялынічах як нейкая нечаканасць.

— Мусіць, — гаворыць сакратар РК тав. Рымша, — у Менску лічаць наш раён ільнаводчым.

Гэта здзіўленне сакратара паказвае, што да пастановы ЦК у раёне зусім не думалі аб ільнозагатоўках.

Нават пасля таго, як калгасы даўно закончылі асноўныя летнія і асенніх сельскагаспадарчыя работы, калі ўборка бульбы ў пераважнай большасці калгасаў была закончана, кіраўнікі раёна ўсё яшчэ лічылі, што «чарга» да апрацоўкі ільну не падышла.

Патрабавалася рашучае ўмяшанне ЦК, каб прымусіць кіраўнікоў Бялынніцкага раёна апомніцца, што пара ўжо ўзяцца за лён.

Як-жа кіраўніцтва раёна здолела арганізаваць справу, каб пагнаць упушчанае, каб выправіць дапушчаныя грубейшыя апартуністычныя памылкі?

Ход выканання плана за пяцідзённку, з 10 па 15 кастрычніка, паказвае, што належнага пералому яшчэ не наступіла. Той нязначны зрух, які назіраўся за апошнюю пяцідзённку, трэба аднесці выключна за лік перадавых калгасаў, як «Праўда», «Чырвоны бор» і іншых, якія завяршаюць выкананне плана ільнозагатовак. **Значная-ж колькасць калгасаў, нават і асобныя сельсоветы яшчэ і зараз не прыступілі да пераапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі.**

Памочнік начальніка палітаддзела па жонрабоце, напрыклад, лічыць зусім нармальным, што калгас імя X з'езда советаў не прыступіў да апрацоўкі ільну, бо, бачыце, гэты калгас яшчэ не завяршыў копкі бульбы. **Такім чынам, настрой чарговасці яшчэ і зараз** даюць сабе адчуваць у рабоце раённых арганізацый і, у прыватнасці, палітаддзела.

Ды і ў тых калгасах, дзе апрацоўка ільну пачата, яна праводзіцца недапушчальна марудныя тэмпамі. Дырэктыва ЦК аб пераключэнні 50 проц. працаздольных калгаснікаў на апрацоўку ільну ў раёне яўна ігнаруецца. **У калгасе імя Будзённага (старшыня Окунеў) з 110 працаздольных калгаснікаў і калгасніц на ільне працуюць толькі 7-10 чалавек.** У калгасе «Чырвоная ніва» з 100 працаздольных на ільне працуе толькі 14 жанчын. Такіх прыкладаў мож на прывесці многа. Але і гэтыя выразна паказваюць, што ў многіх калгасах пераважная большасць калгаснікаў і калгасніц ходзяць без работы, а на ільне працуюць толькі адзінкі.

Аб прычынах масавага нявыхаду жанчын на работу яснa гаворыць **калгасніцы-ўдарніцы** калгаса «Чырвоная ёлка» тав. Цімафеева і Раўкова.

— Аб ільняных працаднях мы нават не чулі. Нам і ў мінулым годзе абяцалі даць прэміроўку за апрацоўку ільну. А як прышлося, дык атрымалі тыя, якія ільну і не нюхалі.

— У мінулым годзе, — прызнаецца сакратар РК, — мы гэту справу прахлопалі. Хлеб і прадукты, атрыманыя за лён, раздалі каму папала. І таму калгасніцы правы, што яны адносяцца з недавер'ем да абяцанняў старшыні калгаса.

Што-ж зрабіў райком, каб у гэтым годзе ўнікнуць леташніх памылак, каб узняць аўтарытэт ільнянога працадня? Нічога. Пастаянныя дзённыя нормы ў калгасах не ўстаноўлены. **Аб тым, што за выкананне дзённай нормы ім належыць 2 працадні калгасніцы не ведаюць.** Існуе норма выпрацоўкі на працадзень прычым значна паніжаная не больш 5-6 фунтаў. У калгасе «Ленінскі шлях», Машчанскага сельсавета, на нашу заўвагу, чаму так позна выходзяць на работу, калгасніцы адказалі: «спяшыць нам няма чаго. Норму на працадзень яшчэ выканаем».

Са складаў Заготільна ні адзін калгас яшчэ не атрымаў хлеба за лён. У раёне не было ніводнага выпадку, каб авансавалі калгаснікаў на ільняныя працадні. Хлеб, атрыманы вясной па кантрактацыйных дагаварах, размяркован паміж усімі калгаснікамі.

Ігнараванне дырэктыў партыі і ўрада аб налічэнні ільняных працадзён і аб размеркаванні хлеба і прадуктаў, атрыманых за лён, на гэтыя працадні прыводзіць не толькі да замаруджання тэмпаў пераапрацоўкі, але і да нізкай якасці яе. **Такія элементарныя правілы, як адлежка ільну пасля сушкі і мяцця, ні ў адным калгасе раёна не праводзяцца.** Не ва ўсіх калгасах вылучаны нават сартавальшчыкі ільну. У большасці выпадкаў лён проста з ільнопрацоўчага пункта ідзе на заводы. Гэта прыводзіць да паніжэння нумарнасці ільновалакна.

Роля адказных па ільну ў калгасах Бялынніцкага раёна не адчуваецца. У калгасе «Чырвоная ёлка» адказная па ільну Калтунова з'яўляецца самым актыўным арганізатарам антыільняных настрояў. Яна агітуе за нізкія нормы і за ніжэйшую якасць валакна. У калгасе «Ленінскі шлях» адказныя па ільну вылучаюцца... па адзін дзень. «Быў, кажуць калгасніцы, учора Свірэйка, а сёння каго назначаць мы яшчэ не ведаем». Такім чынам, працэс апрацоўкі ільну праходзіць самацёкам.

Усе гэтыя моманты сведчаць аб тым, што ацэнка, даная ў пастанове ЦК аб неарганізаванасці і безадказнасці ў справе першапачатковай пераапрацоўкі і здачы ільну па Бялынніцкаму раёну астаецца ў сіле і зараз. Раённае кіраўніцтва пакуль абмежавалася прыняццем агульных рэзалюцый, рассылкай людзей па сельсоветах і калгасах, але за арганізацыю справы ў калгасах і сярод аднаасобнікаў яшчэ не прыступлена.

ГРЫНГЛАЗ.

Старшыням горрайпрофсоветаў, райупаўнаважаным ЦСПСБ і старшыням ФЗМК, рэдактарам раённых і фабрычна-заводскіх газет, сакратарам раённых і заводскіх комсамольскіх камітэтаў

Прайшло больш трох месяцаў з дня апублікавання пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ аб падрыхтоўцы да зімы.

Набліжаюцца окцябрскія дні. Для святкавання ХУП гадавіны Окцябра арганізуйце масавую прадокцябрскую праверку рэалізацыі рашэнняў ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ

З 25 кастрычніка па 5 лістапада абвяшчаем усебеларускі рэйд па праверцы гатоўнасці да зімы.

Рэйд правесці сіламі ўдарнікаў друку, груп масавага рабочага кантролю і груп «лёгкай кавалерыі».

Неабходна праверыць становішча гатоўнасці да зімы ўсіх рабочых кватэр, інтэрнатаў, складаў, гароднінахавалень, месца захавання бульбы і ўсіх прыкватэрных прыбудоў.

Праверыць работу майстэрань па рамонту абутку і адзежы на прадпрыемствах і прыняць меры для паляпшэння іх работы.

Для кіраўніцтва рэйдам стварыць тройкі ў складзе старшынь райпрофсоветаў, і райупаўнаважанага ЦСПСБ, рэдактароў райгазет і сакратароў РК ЛКСМБ. На прадпрыемствах адказнасць ускласці на фабком, комсамольскі камітэт і рэдактара заводскай газеты.

Аб ходзе работы сістэматычна інфармаваць ЦСПСБ, «Звязду» і ЦК ЛКСМБ.

Сакратар ЦСПСБ ГЕРАУКЕР.
Адк. рэдактар «Звязды» ЛЕНЦНЕР.
Сакратар ЦК ЛКСМБ АЎГУСТАЙЦІС.

Да збору бавоўны прыступіў калгас Бараколь (Крым, Стара-Крымскі раён). У першы дзень калгас сабрана 300 клг. бавоўны.
НА ЗДЫМКУ: Калгаснікі здаюць на ваг бавоўну, сабраную з прымацаваных да іх участкаў.

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

ВЫНІКІ ЧАЦВЕРТАЙ ПЯЦІДЗЁНКІ

Чацвертая пяцідзёнка кастрычніка ще дала яміх-небудзь рэальных зрухаў. Крывая закупкі хлеба прадаўжае падаць. У трэцяй пяцідзёнцы закуплена 25.633 цэнтнеры, а ў гэтай толькі 19753.

Трэба шрама сказаць, што райспажыўсаюзы і сельпо не падначалілі сваёй работы закупкам хлеба.

Планаванне ўлазраў хлебнага фонду праводзіцца яўна няправільна. Раёны, закупіўшыя менш хлеба, часамі атрымліваюць больш тавараў стымулявання (Клімавічы, Чырвонаполле).

Наша сельпо і райспажыўсаюзы сказваюць часта мядзвежую ўслугу хлебазакупкам. Закупіўшы хлеб у калгасах з фонду на гасподарчае будаўніцтва, яны не лічаць неабходным нават пры назіўнасці высокай эцэнкі працадня закупаць хлеб у калгаснікаў і аднаасобнікаў, пакідаючы іх такім чынам без неабходных тавараў. (Расоны, Асіпавічы і інш.).

Нашы базы, сельпо замест таго, каб напулярызаваць сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў тавары хлебнага фонду, трымаюць тавары ў сакрэце, пакідаюць лепшыя з іх на базах, крамах (Чэрыкаў, Слуцак).

На 20 кастрычніка не вывезена з глыбінак звыш 9 тысяч тон, — закупленага хлеба.

Гэта сведчыць, што хлеб асядае ў глыбінках, што многія РК і РВК не лічаць для сябе неабходным дапамагчы кааперацыі прадастаўленнем транспарта.

Прыклады Віцебскага, Гомельскага, Дзяржынскага, Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Лоеўскага, Менскага і Прапойскага раёнаў, якія закупілі хлеба больш, чым яны меркавалі, гавораць аб тым, што няма ніякіх прычын да адставання іншых раёнаў па закупцы хлеба.

ПЕРАДАВІКІ ХЛЕБАЗАКУПАК

Менскі раён (сакратар ГК КП(б)Б Рыскін, старшыня оргкамісіі РВК Турэцкі, старшыня райспажыўсаюза Эрэнбург).

Віцебскі (сакратар ГК КП(б)Б Жураўлёў, старшыня горсовета Аверын, старшыня РСС Кац).

Гомельскі (сакратар РК КП(б)Б Шафарэнка, старшыня горсовета Малашонак, старшыня РСС Сліцын).

Дрысенскі (сакратар РК КП(б)Б Бурачэўскі, старшыня РВК Антонаў, старшыня РСС Грынблат).

Дзержынскі (сакратар РК КП(б)Б Дамброўскі, старшыня РВК Вансоўскі, старшыня РСС Сасноўскі).

Касцюковіцкі (сакратар РК КП(б)Б Лысковіч, старшыня РВК Шкалаў, старшыня РСС Ермаленка).

Клімавіцкі (сакратар РК КП(б)Б Анісаў, старшыня РВК Сельвестраў, старшыня РСС Рабінович).

Прапойскі (сакратар РК КП(б)Б Кавалёў, старшыня РВК Чарнабродаў, старшыня РСС Грахоцкі).

Лоеўскі (сакратар РК КП(б)Б Кірушчанка, старшыня РВК Новікаў, старшыня РСС Сурпін).

ВОСЬ ХТО ЗРЫВАЕ ХЛЕБАЗАКУПКІ

БРАГІНСКІ раён (сакратар РК КП(б)Б Кожар, старшыня РВК Хілімонаў, старшыня райспажыўсаюза Таўкачоў).

БУДА-КАШАЛЕЎСКІ (сакратар РК КП(б)Б Пеўзнер, старшыня РВК Буцько, старшыня райспажыўсаюза Турко).

ДУБРОВЕНСКІ (сакратар РК КП(б)Б, Мышалаў, старшыня РВК Мацько, старшыня РСС Захарэнка).

КАМАРЫНСКІ (сакратар РК КП(б)Б Трызна, старшыня РВК Гузаў, старшыня РСС Сямашка).

МСЦІСЛАЎСКІ (сакратар РК КП(б)Б Штэйнгарт, старшыня РВК Рай, старшыня РСС Падольцаў).

ПЛЕШЧАНІЦКІ (сакратар РК КП(б)Б Паромчык, старшыня РВК Лясовіч, старшыня РСС Лук'янаў).

СТАРА-ДАРОЖСКІ (сакратар РК КП(б)Б Шалапёнак, старшыня РВК Асташонак, старшыня РСС Вербін).

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ (старшыня РК КП(б)Б Лапацін, старшыня РВК Дупанаў, старшыня РСС Шугаёў).

КЛІЧАЎСКІ (сакратар РК КП(б)Б Цішкевіч, старшыня РВК Дзейко, старшыня РСС Юдкін).

ЧЭРВЕНЬСКІ (намеснік сакратара РК КП(б)Б Лебедзь, старшыня РВК Бушман, старшыня РСС Малый).

ЗАКУПІЛІ... САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

РАСОНЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

— Ітак, таварышы, усе згодны прадаць хлеб кааперацыі? Згодны?... Вельмі добра. Значыць, лічым, што калгас прадаў дзяржаве яшчэ 2 тоны. Так і запішам...

І запісаў старшыня Гарбачоўскага сельпо тав. **Святліцкі** ў свой блок-нот новую «перамогу». Унёс у зводку яшчэ 2 тоны і паведаміў райспажыўсаюзу:

—На 10 кастрычніка закуплена па калгасах Гарбачэўскага сельсовета 8 тон хлеба, па аднаасобнаму сектару — 2,4 тоны.

Хлеб ляжыць яшчэ ў свірнах калгасаў немалочаны. Аднаасобнікі не прывезлі на пункт піводнага кілограма, а старшыня сельпо рапартуе аб закупцы. Хоць няма хлеба, але ёсць самаабавязацельствы, — ён і гэтым задаволен.

На справе замест 8 тон хлеба, якія лічацца закупленымі ў калгаснікаў, на склады паступілі толькі 2 тоны. Замест 2,4 тоны, «закупленых» у аднаасобнікаў, паступіла толькі 400 кілограмаў.

Ці ведаў райспажыўсаюз аб махінацыях Святліцкага? Ведаў. Не толькі ведаў, нават і санкцыянаваў. Старшыня райсаюза тав. **Тарасевіч** адкрыта заяўляе, што занясенне ў зводку непаступіўшага хлеба — масавая з'ява ва многіх сельпо.

Па зводках райспажыўсаюза на 15 кастрычніка лічыцца закупленымі 118 тон. А ў сапраўднасці-ж паступіла толькі каля 45 тон. Астатні хлеб закуплен... на паперы.

У крамах сельпо нельга знайсці шкла, жалеза, цукру, абутку і іншых тавараў, на якія прадавец хлеба прад'яўляе вялікі попыт.

Райспажыўсаюз і сельпо пашлі на шляху найменшага супраціўлення. Са 118 тон хлеба, які нібы закуплен, 110 тон прыпадаюць на калгасы і толькі 8 тон на калгаснікаў і аднаасобны сектар.

Зусім праваліла закупкі Заготзярно. Замест 100 тон, якія яны меркавалі купіць, закуплена толькі 7½ тон. Але і гэтыя закупкі праведзены своеасабліва. Заготзярно проста перахватвае той хлеб, які калгаснікі ўжо раз прадалі спажыўкааперацыі.

Перахапіць, заплаціць за хлеб у другі раз і ўнесці яго ў зводку як закуплены Заготзярно — вось стыль і метады работы расонскай канторы.

Астаецца толькі дадаць, што раённыя арганізацыі добра ведаюць аб гэтых жульніцкіх махінацыях.

С. ГАЛКІН.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

Курам на смех...

У студзені 1932 года быў арганізаваны пры Трудаўскім соўгасе птушкаводны тэхнікум.

Мэта гэтага тэхнікума, — мабыць —выхаванне птушкаводных кадраў.

Але гэта мая асабістая думка, неабавязковая для кіраўніцтва тэхнікума.

Я не нікому і не навязваю.

Я толькі выказваю думку, што каб мяне назначылі за дырэктара тэхнікума, я іменна ў гэтым сэнсе і праводзіў-бы заняткі. Бо, вядома, чалавек я, як птушкавод і педагог, новы, спецыяльнай асветы па гэтаму пытанню не маю — па прастаце сваёй, значыць, я і лічу выхаванне студэнтаў галоўнай задачай тэхнікума.

А яно, выходзіць, галоўная задача кіраўніцтва — эксперыментаваць.

Праводзіць эксперыменты, значыць...

Пачалося, мабыць, усё гэта з-за Мічурына.

Дачулася аднекуль кіраўніцтва трудаўскага тэхнікума аб тым, што недзе на Казлоўшчыне стары Мічурын робіць дзівосныя справы.

Вось ім стары Мічурын які-небудзь персік, скрэсціць з якім другім салодкім фруктам, — глядзіш, — праз некаторы час вырастае новы гібрыд...

Задумалася і кіраўніцтва тэхнікума...

— А што, каб гэтыя цікавыя вопыты ды ў нашым раёне...

Ды не з фруктамі якімі для асалоды, а ў больш шырокіх памерах.

І вось праз адзін год і адзін месяц вучобы птушкаводны тэхнікум пераводзяць з Трудаў у Пракопаўку, Церахаўскага раёна, для таго, каб злучыць яго з кролікаводчым тэхнікумам.

Напружаныя дні пачаліся пасля гэтага для кіраўніцтва тэхнікума.

— І які, думаюць, гібрыд ад птушкі і кроліка выйдзе?

Восем месяцаў цярпліва чакалі вынікаў, на дзевяты склалі сваю маемасць і пачалі пераезд у Беліцу, Сенненскага раёна.

Трэба, сказаць шчыра, у імя навукі кіраўніцтва тэхнікума не шкадавала ні грамадскіх сродкаў, ні сваіх уласных сіл і здароўя.

У Беліцы птушкаводны тэхнікум быў ужо зліты з тэхнікумам буйнай рагатай жывёлы.

Зноў наступілі напружаныя дні. — І які, думаюць, гібрыд ад птушкі і буйнай рагатай жывёлы выйдзе?

Зноў роўна восем месяцаў чакала вынікаў кіраўніцтва.

Заняткі, між тым, ішлі... Апошняму курсу аставалася тры месяцы да сканчэння тэхнікума.

На дзевяты месяц кіраўніцтва тэхнікума ўхваліла перавесці ўсіх студэнтаў-птушкаводаў на аддзяленне буйнай рагатай жывёлы, і прыбаўціць ім для гэтага 6 месяцаў.

Гэта праз два гады і чатыры месяцы вучобы.

Гэта за тры месяцы да выпуску апошняга курса.

Гібрыд, значыць, не ўдаўся...

Ёсць чуткі, што калі ў дырэктара гэтага тэхнікума **Лабанка** студэнты пытаюцца, — як гэта яны па спецыэ за 6 месяцаў стаць зоатэхнікамі і навошта тады яны вучыліся 2 гады і 4 месяцы па птушкаводаў, — у адказ на гэтыя запытанні Лабанок спявае пеўнем і гаворыць, што аддаць гэтакі загад яго падвучылі куры...

Трэба, мабыць, паклапаціцца, каб не смяяліся куры над дырэктарам.

АЛЕША.

Двор Мар'іеўскай шоўкавай фабрыкі.

ПАЛІТДЗЕНЬ НА ШАЎКОВАЙ

Даволі было заглянуць ў любы куток фабрыкі—у цэх, сталоўку, магазін, у кантору, на сквер, — і ўжо можна было заўважыць, што тут рыхтуюцца да палітдня, які, да рэчы, моцна заваяваў правы грамадзянства ў сістэме масававыхаваўчай работы партыйнай арганізацыі фабрыкі.

9 кастрычніка тут адбыўся ўжо трэці па ліку палітдзень.

Першы быў у пачатку ліпеня. Тады ў аснову тэмы палітдня былі пакладзены пытанні міжнароднай палітыкі наогул і ўсе пытанні ўнутрыфабрычнага жыцця.

Другі раз эмест палітдня быў ужо больш акрэслены, мэтаімкнёны: ленінская нацыянальная палітыка і ў сувязі з гэтым жыццё і работа фабрыкі.

У аснову трэцяга палітдня, выходзячы з таго, чым цікавіліся рабочыя на сходах, чарадах і прыватных гутарках, партыйны камітэт паставіў надзённае пытанне з міжнароднай палітыкі: СССР і Ліга нацый.

Партыйная арганізацыя і лепшыя ўдарнікі чырвонасцяжнай шаўковай фабрыкі запрасілі да сябе на гэты палітдзень сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Валковіча.**

Надзвычай дружна збіраліся рабочыя і работніцы ў прасторную залу пагутарыць з сакратаром ЦК.

Калі за сталом прэзідыума з'явіўся тав. **Валковіч,** доўга ў залі не змаўкалі гучныя воплескі паўтаратысячнай аўдыторыі.

Тав. Валковіч атрымаў ад рабочых каля 200 пытанняў.

Сістэматызуючы і групуючы пасобныя пытанні, тав. Валковіч дае на іх кароткія, зразумелыя і вычарпальныя адказы. І калі глянеш у аўдыторыю—па сур'ёзныя твары старых кадравікоў і па іскрыстыя вочы маладняка,—бачыш адно: пільную ўдумлівасць, гатоўнасць «праглынуць» і асмысліць кожнае слова.

А калі адказы былі зроблены, на трыбуну пачалі выходзіць рабочыя, работніцы, інжынеры.

На трыбуне рабочы механічнай майстэрні т. Станкевіч:

— Добрыя, зразумелыя адказы мы атрымалі на свае пытанні ад тав. Валковіча. Многа новага і цікавага я даведаўся на гэтым сходзе. Нам яшчэ многа, многа трэба вучыцца

Работніца матальнага цэха тав. **Міркіна** асаблівы ўпор зрабіла на тое, што з палітычнай пісьменнасцю на фабрыцы яшчэ далёка не ўсё добра, што тут нямала работніц, якія нядаўна прышлі з вёскі, многа чым цікавяцца, але мала яшчэ ведаюць:

— Вывесілі мы аб'явы, на сходах у нас гаварылі, што палітдзень прысвечан пытанню аб уступленні СССР у Лігу нацый. А да мяне не мала работніц зварочвалася: «А што такое Ліга Нацый?» Сёння яны аб гэтым даведаліся. І яшчэ шмат аб чым. І я хачу сказаць адно: мала таго, што наш тэкстыльны корпус атрымаў за добрую работу чырвоны сцяг. Трэба, каб кожная тэкстыльшчыца была актыўным членам Асоавіяхіма...

У сваім заключным слове тав. Валковіч адзначыў:

— Гэты палітдзень з выключнай выразнасцю паказаў, як шчарка расце свядомасць шырокіх працоўных мас, іх палітычная і грамадская актыўнасць. Нават самыя дробныя падзеі ў міжнародных справах не асталіся незаўважанымі. А гэта значыць, што перад кіраўнікамі прадпрыемства, раёна паўстаюць складаныя задачы: умець па-дзелавому, зразумела і правільна адказаць на кожнае пытанне рабочага, задаволіць яго ўзросшыя запатрабаванні. **В. Д.**

РЭЗУЛЬТАТЫ ТРОХ КВАРТАЛАУ

(Ад барысаўскага карэспандэнта «Звязды»)

Прамысловасць Барысава ў бягучым годзе заняла адно з ганаровых месц у калоне перадавікоў. Аб гэтым пераканаўча сцвярджае тое, што з квартала ў квартал асноўныя прадпрыемствы выконваюць і перавыконваюць свой промфінплан як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Дзевяцімесячны (III квартал) вытворчая праграма ў вогуле выканана на **102 проц.** У прыватнасці Бярэзінскі камбінат выканаў дзевяцімесячны план на **104,7 проц.**, шклозавод імя Домбаля на **106 проц.**, макаронная фабрыка імя Леніна на **103 проц.**

Узнялася прадукцыйнасць працы: па «Бярэзіне» **103 проц.**, заводу імя Домбаля—**110 проц.**, «Ком'інтэрн» —**110 проц.**, заводу імя Молатава—**103 проц.**, фабрыцы імя Леніна—**110 проц.**, а па гарбарні нават на **137 проц.**

Нашоў уніз брак прадукцыі. Па вадучаму прадпрыемству—запалкавай фабрыцы «Пролетарская перамога» брак знізіўся па ўсіх відах прадукцыі. Наогул, за рэдкім выключэннем брак укладваецца ў план.

Такавы асноўныя паказальнікі работы барысаўскіх прадпрыемстваў за прашоўшыя тры кварталы.

Аднак, заўчасна было-б супакойвацца.

102 проц. выканання плана—гэта сярэдняя па гораду лічба, за якой хаваюцца **адстаючыя** прадпрыемствы. Напрыклад, дрэваапрацоўчы камбінат «Ком'інтэрн» 9-месячны план выканаў на 96 проц., «Чырвоны металіст» — на **79 проц.**, фабрыка **«Профінтэрн»** — на **70 проц.**

Адставанне гэтых прадпрыемстваў не з'яўляецца выпадковым. Дрэнная арганізацыя вытворчых працэсаў прыводзіць да частых прастояў. Напрыклад, **«Профінтэрн»** за бягучы год мае **4501** гадзіну прастояў (у сярэднім па **45** гадзін на аднаго рабочага). Па заводу імя Молатава пры яго ніз значных размерах—**3343** гадзіны прастояў. Гэтым хварэюць нават перадавікі, як фабрыка «Пролетарская перамога», дзе прастоі таксама займаюць вялікае месца.

Прычын прастояў вельмі многа. Але галоўнай з іх з'яўляецца няспраўнасць абсталявання, што ў сваю чаргу ўпіраецца ў нізкую падрыхтаванасць тэхнічнага персаналу. На папяровай фабрыцы «Профінтэрн» у механікаў вельмі нізкая кваліфікацыя. Там, дзе можна недахоп выправіць на месцы, прафінтэрнаўскія мацёры і тэхнікі зусім спыняюць машыны. А раз спыніў папяровую машыну на 5 мінут, яна прастойвае гадзіну, бо для таго, каб панава пусціць машыну, трэба рабіць прамыўку сіт, новую запраўку абсталявання. Апрача таго, пры падобных астаноўках трацціца дарагі час, зніжаецца якасць прадукцыі. Гэтым і тлумачыцца вялікая колькасць браку і цікудышнасць прадукцыі гэтых прадпрыемстваў. На 50 проц. вышэй плана ўзняўся сабекошт гатовай прадукцыі.

Акрамя вялікіх прастояў, растрата рабочага часу праходзіць і ў другім напрамку. Далёка не ўсе 420 мінут скарыстоўваюцца на карысную работу. Вось фатаграфія рабочага дня Міхалевіча—рабочага фабрыкі «Пролетарская перамога». Яго варштат працаваў **304** мінуты, а **116** мінут пашлі на:

рамонт—12 мінут; падноска і запраўка этыкетаў—10 мінут; чыстка машыны — 7 мінут; залом каробкі і здым яшчыка 13 мінут; прастой з-за адсутнасці паўфабрыката...72 мінуты.

З гэтага хронометражнага аналіза, як на далоні відаць, што перашкаджае Міхалевічу прадукцыйна працаваць усе 420 мінут.

Як бачым з вышэйпрыведзеных фактаў, буйныя зрывы на асобных вучастках маюць амаль усе прадпрыемствы. Тады чым-жа тлумачыць тое, што большасцю фабрык і заводаў промфінплан выконваецца нядрэнна?

Тлумачыцца тым, што кожнае прадпрыемства мае безлічы магчымасцей палепшыць сваю работу. Асноўныя магчымасці барысаўцы скарыстоўваюць добра. Але калі яны па-большэвіцку возьмуцца за перамаганне пералічаных «дроблзей», работа ўзнімецца яшчэ вышэй. Можна з упэўненасцю сказаць, што барысаўскія прадпрыемствы могуць датэрмінова выканаць промфінплан 1934 года.

У сувязі з вышэйпералічанымі фактамі паўстае і другое вельмі важнае пытанне, а іменна пытанне аб узняцці планаў на ўзровень аб'ектыўнай магутнасці прадпрыемства. Гэта асабліва патрэбна ўлічыць пры распрацоўцы планаў на будучае.

Перадавыя прадпрыемствы ў гэтым напрамку праяўляюць вельмі каштоўны пачын. Партарганізацыя і комсамол фабрыкі «Пролетарская перамога» праводзяць падрыхтоўку да дня найбольшых паказальнікаў. Для гэтай мэты створаны 4 камісіі, якія займаюцца канкрэтным участкам (тэхнарманаванне, зарплата, вывучэнне вытворчых магчымасцей і т. д.). Для таго, каб дасягнуць найвышэйшых паказальнікаў, мабілізуюцца ўсе сілы фабрыкі.

Мэта гэтай работы—тыя паказальнікі, якія будуць дасягнуты ў ліпень найвышэйшых паказальнікаў, паставіць як план, як законную норму, што можа даць прадпрыемства пры бездакорнай рабоце ўсіх звенняў. **ЧЫКУН.**

ДА ХУІІ ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

„Наша Окцябрская рэвалюцыя адкрыла новую эпоху сусветнай гісторыі" Ленін

БОЛЬШЭВІЦКІ ЦК ПРЫМАЕ ПАСТАНОЗУ АБ УЗБРОЕНЫМ ПАЎСТАННІ

23 (10) кастрычніка. Петраград. Адбылося пасяджэнне РСДРП(б) з удзелам Леніна і Сталіна для вырашэння пытання аб узброеным паўстанні. На гэтым пасяджэнні была прынята рэзалюцыя за узброенае паўстанне, выходзячы з ацэнкі бягучага моманту, данай Леніным на пасяджэнні ЦК і яшчэ раней (12 кастрычніка) у яго артыкуле «Крызіс назрэў», дзе ён пісаў: «... Перамога паўстання забяспечана цяпер большэвікамі: 1) мы можам (калі не будзем «чакаць» совецкага з'езда) ударыць **раптоўна** і з трох пунктаў — з Піцера, з Масквы, з Балтыцкага флота; 2) мы маем лозунгі, забяспечваючыя нам падтрыманне: далоў урад, пераважная большасць сялянства супроць нас, намешчыкаў; 3) мы ў большасці ў **краіне;** 4) развал у меншавікоў і эсэраў поўны; 5) мы маем тэхнічную магчымасць узяць уладу ў Маскве (якая магла-б нават пачаць, каб паразіць ворага нечаканасцю); 6) мы маем **тысячы** узброеных рабочых і салдат у Піцеры, якія могуць **адразу** узяць і зімні палац, і генеральны штаб, і станцыі тэлефонаў, і ўсе буйныя друкарні; не выбіць нас адтуль, а агітацыя ў арміі пойдзе такая, што **нельга** будзе змагацца з гэтым урадам Міру, сялянскай зямлі і т. д.»

(ЛЕНІН, т. XXI, стар. 240-241).

ПАСЯДЖЭННЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА РСДРП(б)

(З пратакольнага запісу)

ДАКЛАД ЛЕНІНА АБ БЯГУЧЫМ МОМАНЦЕ

23 (10) кастрычніка 1917 года ... Большасць цяпер за намі. Палітычна справа зусім наспела для пераходу ўлады.

Аграрны рух таксама ідзе ў наш бок, бо ясна, што патрэбны гераічныя сілы, каб прыдушыць гэты рух. Лозунг пераходу ўсёй зямлі стаў агульным лозунгам сялян. Палітычная абстаноўка, такім чынам, гатова. Трэба гаварыць аб тэхнічнай старане. У гэтым уся справа... Чакаць да Устаноўчага сходу, які яўна будзе не з намі, няма сэнсу, бо гэта значыць ускладняць нашу задачу. Абласны з'езд і прапановы з Менску трэба скарыстаць для пачатку рашучых дзеянняў».

Тав. Свярдлоў ... «З Менска паведамляюць, што там рыхтуецца новая карнілаўшчына. Менск, з прычыны характару гарнізона, акружан казачымі часцямі. Ідуць нейкія перагаворы паміж штабам і стаўкай падаэроднага характару. Вядзецца агітацыя сярод асетын і асобных часцей войск супроць большэвікоў. На фронце-ж настрой за большэвікоў. Пойдуць за намі супроць Керэнскага. Ніякіх дакумэнтаў няма. Яны могуць быць атрыманы, калі захапіць штаб, што ў Менску зусім магчыма тэхнічна; пры гэтым мясцовы гарнізон можа разброіць усё кольца войск. Уся артылерыя загнана ў Пінскія балоты. Могуць з Менска паслаць корпус у Петраград».

РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ УЗБРОЕНЫМ ПАЎСТАННІ, ПРЫНЯТАЯ ЦК

ЦК прызнае, што як міжнароднае становішча рускай рэвалюцыі (паўстанне ў флоце ў Германіі, як раннее праяўленне нарастання ва ўсёй Еўропе сусветнай социялістычнай рэвалюцыі, потым пагроза міру імперыялістаў з мэтай задушэння рэвалюцыі ў Расіі), так і ваеннае становішча (несумненнае рашэнне рускай буржуазіі і Керэнскага з К° здаць Піцер немцам), так і набыццё большасці пролетарскай партыі ў советах — усё гэта ў сувязі з сялянскім паўстаннем і з паваротам народнага даверя да нашай партыі (выбары ў Маскве), нарэшце, яўная падрыхтоўка другой карнілаўшчыны (вывад войск з Піцера, падвоз к Піцеру казакаў, акружэнне Менска казакамі і інш.) — усё гэта ставіць на чаргу дня ўзброенае паўстанне.

Прызнаючы, такім чынам, што ўзброенае паўстанне неміпуча і зусім наспела, ЦК прапануе ўсім арганізацыям партыі кіравацца гэтым і з гэтага пункту погляду абмяркоўваць і вырашаць усе практычныя пытанні (з'езда советаў Паўночнай вобласці, вываду войск з Піцера, выступленні масквічоў і менчан і т. д.).

(Пратаколы ЦК РСДРП (жнівень 1917 — люты 1918 г., «ГИЗ», 1929 г., стар. 99-101»).

23 (10) кастрычніка. Менск. Выйшаў № 2 газеты «Буревестник» (орган Паўночна-Заходняга абласн. бюро большэвікоў, замест, закрытай 19 кастрычніка па загаду Вярхоўнага галоўнакамандуючага Керэнскага газеты «Молот».

З РЭЗАЛЮЦЫІ І ПАСТАНОВЫ II ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ КАНФЕРЭНЦЫІ БОЛЬШЭВІКОЎ

I. ПА ПЫТАННЮ АБ ПЕРАВЫБАРАХ У СОВЕТЫ, КАМІТЭТЫ І АБ ТАКТЫЦЫ ПАРТЫІ.

Канстатуючы:

1. Што акрэсліваемая сваім ходам рэвалюцыі барацьба двух асноўных сіл — рэвалюцыйных салдат, рабочых і сялян, з аднаго боку, і контррэвалюцыйнай буржуазіі ўсіх адценняў — з другога, на хлебе пасоўваючагася эканамічнага крызіса і прадаўжаючайся губіцельнай вайны, робіць даны момант крытычным і ставіць пытанне: быць ці не быць усяму таму, у імя чаго ўзвіўся чырвоны сцяг рэвалюцыі з лозунгам: «Мір, хлеб і свабода»;

2. Што бліжэйшая жыццёвая задача выратавання рэвалюцыі і працы ны з'яўляецца ўзяцце ў свае рукі шляхам узгодненай паміж советамі Р. С. і Ч. Д. рэвалюцыйнай ініцыятывы ўсёй паўнаты ўлады як у цэнтры, так і на месцах.

(КП(б)Б у рэзалюцыях, стар. 71). Інстытут гісторыі партыі і Окцябрскай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б.

УВАЗЕ ПАРТКАЛЕГІІ КАМІСІІ ПАРТКАНТРОЛЯ ПА БССР

Змяшчаючы карэспандэнцыю, якая ўскрывае факт «очковтирательства» нараўлянскіх раённых арганізацый, «Звязда» просіць партколегію ўмяшацца ў гэту справу.

Калгасы і аднаасобнікі Нараўлянскага раёна павінны ў гэтым годзе выканаць невялікі план паставак дзяржаве ільнопрадукцыі. Здавалася-б, што партыйная арганізацыя мабілізуе масы на хутчэйшае выкананне плана. Аднак, на справе атрымалася зусім інакш.

На 25 верасня на склад «Заготлён» не паступіла ні аднаго кілограма ільновалакна. Па зводцы Наркамзема раён апынуўся на апошнім месцы.

Улічваючы адставанне Нараўлянішчыны як па зяблеву, бульбапастаўках, так і асабліва па ільнозагатоўках, камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю занесла Нараўлянскі раён на чорную дошку.

Захваляваліся раённыя работнікі... замітусіліся на ўстановах. Непрыемна быць на чорнай дошцы. Нарэшце, старшыня РВК тав. **Элькінд,** як той Архімед, сказаў: «ёсць, выхад знойдзем». Старшыні райспажыўсаюза тав. Адзінцу давяцца ўстаноўка — зрабіць так, каб у наступную пяцідзённку раён быў знят з чорнай дошкі. Тав. Адзінец у сваю чаргу дае ўстаноўку галоўбуху канторы «Заготлён» Світкіну. Былы спекулянт Світкін рад выслужыцца. І кастрычніка ён пасылае ў Менск тэлеграму: «Загатоўлена ільновалакна 1.100 кгр.». На справе-ж за ўвесь час загатоўчай кампаніі на склады не паступіла ні аднаго кілограма.

У выніку «очковтирательской» тэлеграмы па зводцы Наркамзема на 1 кастрычніка раён выходзіць з апошняга на 63 месца. Камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю за ўзмацненне тэмпаў ільнозагатовак знімае раён з чорнай дошкі. Раённыя работнікі ўхмыляюцца: «Мы больш адной пяцідзённкі на чорнай дошцы сядзець не будзем, у нас людзі свае, хутка ўмеюць ім «крутуіцца».

На 5 кастрычніка — ніякіх змен. На склад зноў не паступіла ні аднаго кілограма ільновалакна. На 10 кастрычніка загатоўлена на ўсяго 119 кілограмаў. Менску тэлеграф, у той час, калі ён «паступіла афіна паведамляе: «Абманам пар... 1.200 кіло».

Хлусліўымі весткамі тыі і дзяржаны ніцтва дэмабілізаваны раённае кіраўніцтва масы. Лён па-ранейшаму калгасныя цэпраецца, ільнозагатовак, як і раней, не паступае, ...ажна на скла-

ВОІНАЎ.

Агляд друку

ШУМУ МНОГА — СПРАВЫ МАЛА

„Чырвоны калектывіст"—орган бялыніцкага РК і РВК

Бялыніцкі раён займае адно з апошніх месц у рэспубліцы па ільнозагатоўках. У сваёй пастанове «Аб ходзе ільнопеньказагатовак» ЦК КП(б)Б і СНК БССР абвясцілі вымову сакратару Бялыніцкага РК і старшыні РВК. У пастанове ўказана, што недапушчальнае адставанне раду раёнаў магло атрымацца толькі ў результаце **«поўнага самасупакаення і прамой недаацэнкі значэння ільнозагатовак».** Аб усім гэтым скромна замоўчвае апублікаванае ў **«Чырвоным калектывісце»** ўслед за рашэннем ЦК і СНК рашэнне бялыніцкіх райкома, райвыканкома і палітаддзела. Віна за адставанне раёна цалкам і поўнасцю пераносіцца на... пізавыя арганізацыі.

«А значыць, — гаворыць пастанова, — што па прычыне прамой бяздзейнасці, чарговасці і самацёку ў рабоце, благадушных настрояў і самасупакаення з боку значнай часткі парторгаў, старшынь калгасаў і старшынь саветаў — наш раён ганебна правальвае выкананне плана ільнозагатовак».

Газета «Чырвоны калектывіст» ідзе на стопах сваіх кіраўнікоў. Яна таксама не страдае самакрытыкай і не ўзнімае голасу вышэй работнікаў сельсовета. Вакол работы раённых арганізацый і раённых работнікаў газета арганізавала змову маўчання. Зусім відавочна, што ў Бялынічах агідна працуе, напрыклад, кантора Заготільна, што злачынную бяздзейнасць праяўляюць райза і МТС, але «Ч.К.» ні разу не пацікавіўся недахопамі работы гэтых арганізацый.

«Ч. К.» не заўважае памылак раённых арганізацый таму, што ён сам у сваёй рабоце дапускае тыя-ж самыя памылкі — сама цёк і чарговасць. У жніўні, у верасні газета займалася бульбай хлебам, толькі зрэдку, мімаходам успамінаючы аб ільне і толькі ў кастрычніку пачала заўзята шумець аб прарыве і ўсвячаць ільну паласу за паласой. Але, на жаль, гэта не ёсць нават сноўнае выпраўленне памылкі, большэвіцкае перамаганне сваёй віны. Тое, што, усхамянуўшыся, зараз дае газета аб ільне, выглядае як рэзультат замяшання і бездапаможных заклінанняў. З нумара ў нумар сумна і аднатонна газета канстатуе прарывы:

«У калгасе «12 год Окцябрскай рэвалюцыі» работа па апрацоўцы ільну ўсё яшчэ не арганізавана, не гледзячы на папярэджанне старшыні калгаса Салоніка з боку РК КП(б)Б. Яшчэ не ўсе жанчыны мабілізаваны на апрацоўку ільну, не арганізавана работа, не наладжана спаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі».

Вось заметка, тыповая для «Чырвонага калектывіста». Матэрыялы з розных калгасаў падобны паміж сабой:

— Жанчыны на работу не выходзяць, норм не выконваюць, спаборніцтва не разгорнута, — вось матывы, якія перапяваюцца на тысячы ладоў. Але чаму жанчыны не выходзяць? На Аршаншчыне, напрыклад, выходзяць, а ў Бялынічах не. Жанчыны тут другія, ці што? Газета не ўмее думаць, не ўмее аналізаваць з'яў, не клапоціцца аб тым, каб знайсці асноўнае звяно. А знайсці няпэжка, калі мець мінімальную ўвагу да справы. Асноўнае звяно не канкрэтна занята справай. Зацікаўленасці калгасніка ў апрацоўцы ільну дана ў пастанове Соўнаркома Саюза ССР. Там гаворыцца, што за выпрацоўку нормы па ільну налічваюцца 2 працадні. У калгасах Бялыніцкага раёна інструецца гэты дэкрэт урада. Весь адна з прычын, чаму нормы не выконваюцца. Здавалася-б, першачаровы абавязак газеты — біцца за рэалізацыю гэтага мерапрыемства замест таго, каб займацца бясплоднымі прычытаннямі. Трэба было накіраваць рабкораўскія рэйды, насценны друк на праверку, як налічваюцца працадні, трэба было выкрыць сабатажнікаў гэтага рашэння, дзе-б яны не знаходзіліся — у раённым цэнтры ці ў калгасе, трэба было на канкрэтных прыкладах паказаць усю эфектыўнасць гэтага мерапрыемства. Далей, газета павінна была паклапаціцца, каб калгаснік наглядна, на практыцы пераканаўся, што гэтыя заробленыя два працадні сапраўды аплачваюцца поўнасцю хлебам, зароблены за лён. Для гэтага газета павінна была ўзяць пад кантроль выдачу хлеба па ільняных працадніях. Калі-б газета па-большэвіцку білася толькі за гэтыя два мерапрыемствы — дабівалася правільнага налічэння працадзён і сістэматычнай (раз у пяцідзённку) выдачы хлеба ў калгасах па ільняных працадніях, яна-б дапамагла справе ў сто раз больш, чым усе яе бясконцыя прычытанні і прызывы «мабілізавацца». Але ні хлебам, ні працаднямі газета не цікавіцца.

У Бялынічах вельмі дрэнна з ільнозагатоўкамі, але ўсё-ж і тут ёсць асобныя калгасы, якія ў параўнанні з іншымі ідуць нядрэнна. Абавязак газеты — паказаць другім, як працуюць гэтыя калгасы. Але «Чырвоны калектывіст» таксама няўмела падыходзіць да перадачы вопыту, як і да барацьбы з прарывамі.

Брыгада Сокалава ў калгасе «Праўда» выканала план ільнозагатовак. Буйным шрыфтом на першай старонцы газета абвяшчае:

«Гэтых поспехаў брыгада дабілася толькі таму, што ў цэнтры сваёй работы брыгадзір Сокалаў паставіў работу па ільну, правільна расставіў сілы ўмаранкнем індывідуальнай адзельшчыны, строгім кантролем выканання задання кожнай калгасніцай, спаборніцтва і ўдарніцтва»...

Газета думае, што яна перадае вопыт. На самой-жа справе яна займаецца пустапарожнімі размовамі. Дапусцім, адстаючы калгас прачытае гэту заметку. Што дасць яна яму? Што трэба правільна расставіць сілы, увесці індывідуальную адзельшчыну, арганізаваць кантроль ён, зразумела, чуў не раз. Вось калі-б газета проста і ясна напісала, як-жа іменна расставілі сілы ў брыгадзе Сокалава, па якіх прынцыпах, якім чынам была арганізавана індывідуальная адзельшчына, што яна канкрэтна дала Мар'і або Дар'і і што дала калгасу, якім шляхам быў арганізован кантроль, — тады-б гэта было каштоўнай перадачай вопыту.

Газета «Чырвоны калектывіст» таксама, як і раённыя арганізацыі, многа крычыць аб ільнозагатоўках, але мала робіць для ільнозагатовак. Яна мітусіцца, каб паказаць сваю старанасць, напускае туману, каб прыкрыць сваю галізну, сваё нежаданне і няўменне ўвагу да справы. Асноўнае звяно не канкрэтна занята справай.

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ СОВЕТАЎ

ЯК Я СУМЯШЧАЮ РАБОТУ БРЫГАДЗІРА І ЧЛЕНА МЕСТСОВЕТА

У нашай брыгадзе 138 гектараў worнай зямлі, 100 гектараў сенажаці, 25 коней, пры 10 працаздольных мужчынах і 16 жанчынах.

Рабочых рук у брыгадзе мала. Але, не гледзячы на гэта, мая брыгада заўсёды з'яўляецца перадавой не толькі ў нашым калгасе, але ў раёне і нават у БССР.

Веснавую сяўбу мы правялі высокаякасна, ужаўшыся ў тэрмін. За гэта мяне занеслі на ўсебеларускую дошку перадавых брыгадзіраў, а калгас прэміравали грашыма ў суме 150 рублёў.

За добраякаснае і своечасовае правядзенне ўборкі сенажаці мяне таксама прэміравалі 100 руб. і 150 руб. далі прэмію за ўборку зернавых. Не так даўно мяне прэміравалі Палітсектар Наркамзема СССР радыёпрыёмнікам.

Работы ў маёй брыгадзе праводзіцца заўсёды своечасова і добраякасна. На 20 жніўня мы скончылі сяўбу азімых; скасілі 50 гектараў другога ўкосу сенажаці і да 1 кастрычніка закончылі копку бульбы, падняцце зяблева і здачу дзяржаве ільновалакна.

Мне часта задаюць такое пытанне: як гэта ваша брыгада пры недахваце рабочых рук добра спраўляецца з работай? Асабліва такія пытанні задаюцца брыгадзірамі адстаючых брыгад нашага калгаса. Я ім адказваю:

— Не ўмееце падыходзіць да людзей. Няправільна расстаўляеце сілы брыгады. Не працуеце з імі так, як трэба.

Каб скончыць своечасова засеў 160 гектараў яравога кліну мы зрабілі палаткі на чолі і там бязвыезна жылі, пакуль скончылі сяўбу.

Каз гэтага мы-б часцяхова веснавой сяўбы не правялі, бо зямлі на нашай сіле вялікі многа. У маёй брыгадзе ўсе працуюць добра.

Я не мог-бы прыцягнуць да работы 90-гадовага дзеда Кісялёва Пятра, каб не гаварыў з ім кожны дзень «па душах» і не пра цаваў побач з ім, плячо ў плячо.

Як правіла, я па некалькі раз у дзень бываю на кожным участку работы. Заўсёды на слабых прарыўных участках працую сам з лепшымі ўдарнікамі брыгады.

Калі я быў на злёце перадавых брыгадзіраў у Менску, мне сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** ў прыватнай гутарцы даў указанне, каб я на ўсе працэсы апрацоўкі ільну вызяліў адно частаннае звяно калгасніц. Я так і зрабіў. Вылучылі адказнай па ільну Сашнёву Ганну. Гэта звяно замацавалі для работы па апрацоўцы ільну па ўвесь час. У рэзультаце ільновалакно ў нас вышла на славу. Нежэй 12 нумара дзяржаве не здаем.

Ведучы заўсёды сваю брыгаду перадавой, я не забываю і таго, што з'яўляюся членам Касцюковіцкага местсовета. Тут я працую ў фінансавай секцыі. Мой участак па мабілізацыі сродкаў з'яўляецца таксама перадавым. Гадавы план выкананы на 87 процантаў.

Бліжэйшай задачай, якую паставіла брыгада, не гаворачы ўжо аб падрыхтоўцы да зімы, гэта — да пачатку VII усесаюзнага з'езда советаў у кожную калгасную хату правесці радыё, арганізаваць апратэхвучобу, сістэматычна праводзіць палітвучобу. І гэтага мы дабіемся.

Брыгадзір II брыгады калгаса «Парыжская комуна», Касцюковіцкага местсовета.
ХОМЧАНКА Нікіфар.

НАЛАДЖВАЕЦЦА СПРАВАЗДАЧА ДЭПУТАТАЎ ПЕРАД ВЫБАРШЧЫКАМІ

15 кастрычніка ў начальніка палітаддзела Гомельскага аддзялення эксплаатацыі адбылася нарада сакратароў парткомаў, комсамольскіх калектываў і старшынь мясцовых камітэтаў чыгуначных прадпрыемстваў Гомеля, прысвечаная падрыхтоўцы і правядзенню справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў.

Нарада рашыла правесці па прадпрыемствах адзіны палітпрофдзень, прысвечаны гэтаму пытанню, увязаўшы яго з падрыхтоўкай да XVII гадавіны Окцябра.

На палітдніях будуць выбраны ўпаўнаважаныя для дапамогі гарадской, выбарчай камісіі.

27 кастрычніка будзе праведзен злёт рабочых кадравікоў і «выдатнікаў» для абгаварэння далейшых задач Гомельскага вузла і 31 кастрычніка сход жанчын хатніх гаспадынь па пытанню ўдзелу іх у справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Асобна ў гэты перыяд будзе праведзена масавая работа з рабочымі вёскі аб непасрэдным іх удзеле ў кампаніі і дапамозе ў паспяховым правядзенні перавыбараў на вёсцы. **ЗВЕЛЬШТЭЙН.**

У ГОНАР З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

Па ініцыятыве лепшых ударнікаў 14-та акалотка 31-й дыстанцыі пуці Зах. чыгункі тав. **Ляшова** і дарожнага майстра **Сучковага** 15 кастрычніка ў гонар VII з'езда советаў быў арганізован масавы суботнік рабочых акалотка. Суботнік праходзіў пад лозунгам—адправіць адзін кілометр звыш праграмы ў падарунак з'езду Советаў. На суботнік выйшлі ўсе рабочыя — 60 чалавек. Памёк брыгадамі па месцы былі заключаны соцыялістычныя дагаворы.

Рабочыя далі абяцанне яшчэ больш упарта весці барацьбу за перададную цуцявую гаспадарку і выклікалі наследваць іх прыкладу ўсе акалодкі сваёй дыстанцыі і спаборнічаючых з ёю 30-й і 32-й дыстанцыі Зах. чыгункі.

ДЗЯЖУРНЫ.

Гдоўская шахта ўступіла ў строй



Чатырохтысячны калектыў гарнякоў, будаўнікоў і інжынерна-тэхнічных работнікаў будаўніцтва ленінградскай начагаркі — Гдоўскага апалавага басейна — атрымаў першую перамогу.
Здана, прынята ўрадавай камісіяй і ўступіла ў строй дзейнічаючых прадпрыемстваў Савецкага Саюза першая ў Ленінградскай вобласці слянцавая шахта з гадавой прадукцыянасцю ў 300.000 тон сланца.
Шахта носіць гапаровае імя кіраўніка ленінградскіх большавікоў т. Кірава.
НА ЗДЫМКУ: від стволоў пад'ёмнікаў № 1 і 2 шахты імя тав. Кірава.

ЯК Я ЗМАГАЮСЯ ЗА ГРАМАТНАСЦЬ ВУЧНЯЎ

Вопыт барацьбы за добрую граматнасць вучняў сярэдняй школы, аб якім расказвае ніжэй настаўніца 4-й гомельскай чыгуначнай школы Клаўдзія Іванаўна Чэрнышова, мае шмат каштоўнага, вартага для перайманння настаўнікамі мовы.

Характарна ў рабоце Клаўдзіі Іванаўны тое, што крапатлівая і настойлівая работа па дасягненню правільнасці і чоткасці пісьма вядзецца ёю ва ўсіх класах, нават старэйшых.

Не менш настойліва б'ецца тав. Чэрнышова і над выпрацоўкай каліграфічных навыкаў пісьма. Можа на першы погляд і гучаць дзіўна такія заўвагі настаўніцы ў старэйшых групах накшталт «ты няправільна трымаеш ручку, трымаць яе трэба вось так», «табе трэба пісаць трохі мяльчэй», «у цябе «п» глядзіць у адзін бок, а «н» у другі, не трэба пісаць коса» і т. д.—але прымаючы пад увагу, што ў мінулыя гады на пастаноўку пісьма не зварачалася належнай увагі, вопыт тав. Чэрнышовай трэба толькі вітаць.

Вельмі важнай у рабоце Клаўдзіі Іванаўны з'яўляецца і тая акалічнасць, што яна ДОБРА ВЕДАЕ КОЖНАГА ВУЧНЯ ЛЮБОГА КЛАСА. Праўда, гэта з'яўляецца пярвейшым абавязкам кожнага настаўніка, але, на жаль, многія настаўнікі той-жа 4-й школы, не ведаючы прозвішчаў вучняў, паказам пальцам або ўказкай. А гэта знаходзяцей, выклікаюць асаблівасці асобнага вучня астаюцца невядомымі настаўніку.

Я хачу паведаміць чакальні момантаў з маёй практыкі ў галіне барацьбы за граматнасць вучняў.

Граматнасць — гэта толькі тады моцных, можа быць свядома набытай, калі вучні з'яў арфаграфічнаму да моўнага. Трэба, каб вучань у сваёй працаўнасці ўдзельнай практыцы пісьма ясна ўяўляў, чаму ён пішэ тое ці іншае слова іменна так, а не інакш.

Кожны раз пры разглядзе памылак, зробленых вучнямі, я праводжу з імі марфалагічны аналіз слоў, бо лічу, што толькі пры добрым уменні выдзяляць у слове корань, суфіксы, прыстаўку, канчатак можна ўнікнуць такіх памылак у карэнёх слоў, як «учавствовать», «об'еснять» у прыстаўках—«пашел», «применять», «производить», у канчатках — «к деревни», в жизне» і т. д.

Усю арфаграфічную работу я звязваю з работай па развіццю мовы і ўзбагачэнню слоўніка вучняў. На ўроках літаратуры пры тэкстуальных разборах твораў, я звяртаю ўвагу вучняў на правапіс цяжкіх або новых для іх слоў, **прымушаю выпісваць іх у сшыткі** па граматыцы.

У вучняў павінен быць па магчымасці большы запас зрокавых вобразаў слоў у замяненні з матэрнымі прадстаўленнямі. У мэтах накаплення такога запасу, я, апрача пералічаных відаў работ па арфаграфіі, даю вучням, у якіх не зусім здавальняючая граматнасць, **спісваць у сшыткі к кожнаму ўроку рускай мовы па старонцы з** твораў, прапрацоўваемых на ўроках літаратуры. У большасці выпадкаў я даю пэўныя заданні спісваючым, напрыклад, падкрэсліць у тэксце сумніцельныя галосныя, зычныя, дзеяслоў другой асобы, незначальная формы і т. д. з мэтай звярнуць іх увагу на правапіс пэўнай групы слоў.

Гэты від работы па ўняццю граматнасці я практыкую ўжо другі год і практыка мне паказала, што ён дае саліды эфект. Так, вучні, рабіўшыя 25-30 памылак на старонцы ў пачатку навучальнага года, к канцу года рабілі толькі па 3-4 памылкі.

Ясна, гэты метад патрабуе ад мяне вельмі вялікай работы. Я рэгулярна правяраю ўсё напісанае ў сшытках вучнямі і падрабязна аналізую з імі словы, у якіх зроблены памылкі. Работы я правяраю не толькі з боку граматнасці, але і сачу вельмі пільна за акайнасцю пісьма, за почаркам.

Я сачу за граматнасцю пісьма не толькі ў сшытках па рускай мове, але і па другіх прадметах. Мае дзеці ведаюць, што я ім не пастаўлю добрай ацэнкі па рускай мове, калі ў іх будуць нязбайна і няграматна выконвацца работы па іншых дысцыплінах. Я сачу таксама за тым, каб у насценныя газеты не прайшла ні адна памылка.

Шмат аддаю ўвагі адстаючым. Два разы ў тыдзеньку я яду з імі заняткі. Зараз пачатак навучальнага года, адстаючых па літаратуры цяжка яшчэ выявіць, таму займаюся толькі з адстаючымі па мове, робячы ўпор на арфаграфію.

Адным з момантаў у дасягненні граматнасці з'яўляецца барацьба **за культуру мовы вучняў,** за правільнае, яснае, чоткае афармленне імі сваіх мыслей.

Каб дабіцца ў гэтай галіне рэзультатаў, апрача многіх відаў работ па развіццю мовы, звязаных з прахаджэннем курса па літаратуры і па граматыцы, напр., практыкаванняў па ўжыванне сінонімаў, эпітэтаў, метафар і т. д., я пільна сачу за мовай вучняў і стараюся не прапускаць без выпраўлення ўсіх няправільнасцей іх гаворкі не толькі на ўроках, але і ў часе перамен.

Я яду дакладны ўлік пасяховасці вучняў. Гэта дапамажа мне дакладна ведаць, што ні ў кожнай вучань і своечасова ліквідаваць гэта адставанне.

Ведучы такім чынам работу па рускай мове, думаю, што к канцу навучальнага года я дабіюся добрых рэзультатаў у галіне граматнасці і такім чынам выканаю пастанову партыі і ўрада аб ліквідацыі «карэннага недахопу» ў школе.

К. І. ЧЭРНЫШОВА
Выкладчыца рускай мовы і літаратуры 4-й гомельскай чыгуначнай школы.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ СЛУЦКАГА РК КП(б)Б тав. КІНЖЫМАВУ.

ВЫГНАЦЬ ШКОДНІКАЎ З КАЛГАСА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Старшыня калгаса **«Пераможца»**, Сроднеўскага сельсовета (Слуцкі раён) **Кохан М.** разам са сваім «актывам» — рахункаводам Уласаўцам П. і старшынёй рэвізійнай камісіі Уласаўцам А. кожную ноч наладжваюць п'янкі. Гэта сямейка робіць у калгасе, што ім толькі ўздумаецца. У мінулым годзе быў выяўлен пазахват 235 пудоў жыта.

Размеркаванне ўраджаю ў мінулым годзе праведзена няправільна. Не было ў гэтым годзе належнага кантролю пры малацьбе. У кладовую здавалі без усякай прыёмкі.

Крытыка і самакрытыка ў калгасе заціснута да таго, што калгаснікі на сходах баяцца што-небудзь сказаць.

КАСЦЯЛЕНЯ ЯНКА.

***

СЛУЦАК. (Ад нашага карэспандэнта).

Праверкай на месцы факты, указаныя ў пісьме, поўнасцю пацвердзіліся. Для зацвярджэння плана ўраджаю 1933 года некалькі раз збіраліся агульныя сходы. Але-ж старшыня калгаса Кохан сходы зрываў да таго часу, пакуль калгаснікі перасталі кадзіць. І калі на сходзе была нязначная частка калгаснікаў, якая была больш з сваіх людзей, тады быў зацверджан план размеркавання.

Кохан пры размеркаванні абеспаніў працадні. Так, па плану размеркавання ішаніцы прыпала па 800 грамаў на працадзень, а выдалі толькі па 600. Ячмень пасля раздачы забіралі ў кожнага калгасніка па 1-2 пуды назад. Некаторым калгаснікам нават неаддалі поўнасцю заробленых прадуктаў. Калгаснику тав. Уласаўцу Сёмку не аддалі пуд ішаніцы, матывуючы тым, што «не хапіла».

У калгасе гэта «сямейка» (старшыня праўлення, рахункавод, кладаўшчык і старшыня рэўкамісіі) штодзённа п'янствуе. Па віне гэтай «кампаніі» прапала 7 коней і невядома дзе делася 300 пудоў збожжа. Пры малацьбе ўчоту так сама не было, што хацелі, тое рабілі.

Крытыка і самакрытыка зажата. Калгаснікам забаронена выкрываць недахопы. З красавіка месяца ў калгасе не было ні аднаго сходу. На патрабаванні калгаснікаў аб скліканні агульнага сходу старшыня Кохан заўсёды адказваў: «Працуй, і ўсё, а як пачнеш буйць, праганю з калгаса».

Выпуск насценгазеты Кохан спыніў. Калгаснікі баяцца што-небудзь сказаць, бо за гэта пагражаюць выключэннем з калгаса.

Таму і не выпадкова, што калгас зараз плянецца ў хвасце па выкананню гаспадарча-палітычных кампаній. Сяўба азімых затягнулася аж да 7 верасня. Малацьба зрываецца, сіласаванне таксама. З патрэбных засілаваць 300 тон засілавана толькі 150.

Аб усіх гэтых фактах у раён добра ведаюць, але не прымаюць ніякіх рашучых мер.

НАМЕСНІКУ УПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ тав. КАМЕНЕВУ

ЧАМУ РАЙСПАЖ'ЮСАЮЗ У ПРАРЫВЕ?

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Расоўскі райсаюз ў вялікім фінансавым прарыве. Галоўная прычына ў тым, што ўсе раённыя арганізацыі бяруць крэдыты і не пагашаюць запазычанасць.

Старшыня РВК т. **Партной** на абсталяванне электрастанцыі ўзяў 2.500 руб. і не звярнуў іх. Ён-жа пазычыў 1.500 руб. на харчаванне ўдарнікаў-ільнаводаў і да гэтага часу грошай не аддаў.

Райваенкамат узяў шаф-касу каштоўнасцю ў 1.080 руб. Уся запазычанасць райспажыўсаюзу ад розных раённых арганізацый складае да 6.000 руб.

Не засталіся ў даўгу РК КП(б)Б і райпракурор. Райком партыі ўзяў таксама незгараемую шафкасу каштоўнасцю ў 594 руб., а пракурор набраў канцылярскіх прыладаў на 350 руб.

Усё гэта прывяло да таго, што райсаюз не мае магчымасці выкупляць тавары.

САВІЧ.

САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б тав. ЖУРАЎЛЕВУ

„ГАСПАДАРЫ" РАЙПРОМСАЮЗА

(ПІСЬМО ЧЛЕНА АРЦЕЛІ)

Віцебскі райпромсаюз зусім дрэнна кіруе промарцелямі. На працягу 1933 г. і 1934 г. арцель «8 сакавіка» не забяспечвала сыравінай. Таму промфінплан сістэматычна выконваецца на 50 проц. З-за такога «кіраўніцтва» члены арцелі пачалі разбягацца. З 30 чалавек асталося толькі 11.

Старшыня арцелі **Сорын** не раз звяртаўся ў райпромсаюз, але кіраўніцтва ніякіх мер не прымае.

СУЦЭР.

СТАРШЫНІ АРШАНСКАГА РАЙПРОФСОВЕТА тав. ШАПІРА

ЗГУБІЛІ АШЧАДКНІЖКУ

(ПІСЬМО ДЭМАБІЛІЗАВАНАГА ЧЫРВОНААРМЕЙЦА).

Дэмабілізаваўшыся з Н-та страковага палка, я ў палкавой ашчадкасе аставіў 100 руб., бо при ад'ездзе дамоў атрымаць іх не мог.

Пасля дэмабілізацыі я паступіў у цэнтральную школу «Калгасная моладзь» (м. Копысь, Аршанскага раёна), дзе звярнуўся ў аддзяленне ашчадкасы № 16 за растлумачэннем, як можна атрымаць грошы.

Кіраўнік ашчадкасы забраў мае кніжку і пообяцаў затрабаваць перавод ад палкавой ашчадкасы. Прайшло больш 6 месяцаў і ніяк не магу атрымаць ні кніжкі ні пераводу.

ДЗЕГЦЯРЭНКА.

СТАРШЫНІ МАЗЫРСКАГА РВК тав. ЖОГАВУ

АДЗІН ТЭАТР І ТОЙ БЕСПРЫТУЛЬНЫ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Мозырскі тэатр мае ўсе магчымасці культурна абслугоўваць працоўных горада і акружаючых калгасаў. Але яго кіраўнік Брэгман нічога не робіць.

Зараз працаваць у тэатры нельга: холадна, памяшканне не ацяпляецца, рамонт не праведзен. Тэатр мае запазычанасць да 10.000 рублёў.

Па віне Брэгмана каштоўнае памяшканне псуецца. Дах працякае, машыннае аддзяленне ад паравога атаплення зусім сапсавалася. На сценах параслі грыбкі. Дровам тэатр на зіму не забяспечан.

Горсовет адпусціў на паляпшэнне работы тэатра 30 тыс. руб., але-ж невядома, дзе яны дзеліся. Брэгман зажымае крытыку і самакрытыку сярод тэатральных работнікаў.

КАПЛАН.

ПА СЛЯДАХ ПІСЕМ

„МАЛЫЛЬШЧЫКІ СЕЛЬКОРАЎСКІХ ПІСЕМ"

Пад такім загалоўкам 30 ліпеня г.г. было змешчана ў «Звяздзе» пісьмо селькора Глушко.

Петрыкоўскі райпракурор паведамляе, што ў сувязі са змешчаным пісьмом было праверана рад раённых арганізацый (міліцыя, райздраў, райана і інш.). Пры праверцы факты поўнасцю пацвердзіліся.

За своечасовае рэагаванне пастановай РК КП(б)Б начальніку райза Чарэтніку і загадчыку райана Мажайскаму дана суровая вымова. Начальніку міліцыі Святкову і загадчыку райздрава Фрыдману дана суровая вымова з папярэджаннем.

КААПГАС ПАТРАБУЕ АЗДАРАЎЛЕННЯ

У пісьме пад загалоўкам «Каапгас патрабуе аздараўлення» («Звязда», № 191, ад 28 жніўня 1934 г.) т. Жыцько пісаў, што сярод рабочых каапгаса завода імя Варашылава ніякай масавай і палітычнай работы не вядзецца. Старшыня рабкома сістэматычна п'янствуе. Штрафаванне рабочых стала сістэмай.

Партком завода імя Варашылава паведамляе, што старшыня рабкома т. Парчук з работы зняты і абвешчана яму суровая вымова з папярэджаннем.

Парткомам намечан рад мерапрыемстваў для ўзмацнення партмасавай работы сярод рабочых каапгаса. Накладзеныя на рабочых штрафы адменены.

За рубяжом

РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА У ІСПАНІІ

ПАУСТАНЦЫ АКАЗВАЮЦЬ УПАРТАЕ СУПРАЦУЛЕННЕ

ПАРЫЖ, 21. кастрычніка. (БЕЛТА). З Мадрыда паведамляюць, што апублікавана ўрадавае паведамленне аб занятці войскамі асноўных пунктаў раёна паўстання ў Астурыі. Але ў тым-жа паведамленні гаворыцца, што рэволюцыйныя атрады, якія не здаліся, адышлі са зброяй у горы. Рабочыя прадаўжаюць аказваць упартае супраціўленне войскам. Аб гэтым ускосна гаворыць афіцыяльнае паведамленне, якое прызнае, што з 19.500 вінтовак, захопленых астурыйскімі паўстанцамі на аружэйным заводзе ў Трубіі, да гэтага часу ўдалося адабраць рознымі шляхамі толькі 4.000.

Агенцтва Гавас, перадаючы падрабязнасці барацьбы астурыйскіх гарнякоў, указвае, што цэнтрам руху быў горад Міерэс, нібыта ўзяты ўчора ўрадавымі войскамі. Тут знаходзіўся рэволюцыйны штаб. Адсюль ішло снабжэнне паўстанцаў зброяй. У некаторых мясцах паўстаўшыя апулявалі ўрадавыя грошы і замянялі іх, спецыяльна выпушчанымі бонамі. Адначасова агенцтва паведамляе аб прадаўжаючыхся масавых арыштах і што «ваенныя суды працуюць безупынна».

ЯПОНА-ГЕРМАНСКАЕ ЗБЛІЖЭННЕ

ВАРШАВА, 20 кастрычніка. (БЕЛТА). «Ілюстраваны кур'ер цодзенны» паведамляе, што Інстытут усходніх моваў пры берлінскім універсітэце ў мінулым годзе рэарганізаван. «Японская мова і настаўл японазнаўства сталі найбольш важнымі прадметамі, для вывучэння якіх адводзіцца найбольшая колькасць гадзін і заняткаў у семінарах і да якіх у часе экзаменаў прыяўляецца найбольшая ўвага. Слухачы гэтага інстытута з'яўляюцца сапраўднымі балаўнямі ўрада. З моманту паступлення ў інстытут яны атрымліваюць вялікія стыпендыі, калі абавязваюцца па сканчэнні курса служыць на Далёкім Усходзе. 25 проц. агульнага ліку слухачоў гэтага інстытута складаюць кадравыя афіцэры рэйхсвера.

У апошні час у Германіі пачалі ўзмоцнена таксама падрыхтоўваць лётчыкаў, якія абавязваюцца праслужыць рад гадоў ва Усходняй Азіі. Гутарка ідзе аб кадрах пілотаў, якія павінны ўзмацніць японскую авіяцыю, якая адчувае недахоп у добрых пілотах. Зараз-жа пасля прыходу Гітлера да ўлады ўзніклі два вялікіх, добра субсідыруемых таварыствы, мэта якіх — узаемнае азнаямленне і наглыбленне германа-японскай дружбы: у Берліне пад кіраўніцтвам адмірала Бенке, у Токіо пад кіраўніцтвам адмірала Ямамото. У лістападзе міністра года ў Германію з Японіі прыбыла першая ваенная місія ў складзе 24 афіцэраў на чале з прынцам Токугава. З таго часу адна японская місія за другой наведваюць Германію.

Газета паведамляе пры гэтым, што, жадаючы зрабіць прыемнае Японіі, германская паліцыя выслала з Германіі ўсіх карэйцаў, праследваемых японскімі ўладамі.

„АМАЛЬ ЯК ПРЫЗНАННЕ"

ПАРЫЖ, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Друк зварачае ўвагу на выключную актыўнасць Герынга ў Белградзе. «Эко дэ парыж» піша: «Ён затрымаўся ў Белградзе далей другога надзвычайных прадстаўнікоў замежных дзяржаў, даваў многа інтэрв'ю і, у прыватнасці, абяцаў, што германскі ўрад выдасць Югаславіі ўсіх харвацкіх тэрарыстаў, якія знаходзяцца ў Германіі.

«Гэта абяцанне», заўважае газета, «тычыць амаль як прызнанне. Усе адбываецца, такім чынам, нібы Герынг і Гітлер хацелі-б як найхутчэй вызваліць ад адказнасці германскі ўрад... Неабходна адзначыць, што ачаг харвацкіх тэрарыстаў своечасова пераведзен з германскай тэрыторыі ў Данцыг. Сакрэтная паліцыя Розенберга, разумеецца, у курсе ўсіх гэтых спраў».

ПАКАЗАННЕ ПЕРЫЧА

ПАРЫЖ, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Згодна паведамленню Газас а Льежа, арыштаваны Перыч прызнаўся, што ён атрымліваў ад Павеліча розныя сумы.

Прабыванне ў Льежы ён растлумачыў тым, што чакаў атрымання грошай для паездкі ў Лондан. 2 харваты, арыштаваныя разам з ім, паніны былі нібыта перадаць гэтыя грошы.

АДЗІНЫМ ФРОНТАМ НА БАРАЦЬБУ З ФАШЫЗМАМ

30-ЦІТЫСЯЧНЫ МІТЫНГ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Антыфашысцкі мітынг, арганізаваны камітэтам барацьбы за вызваленне ахвяр фашызму, сабраў учора на стадыёне Буфало звыш 30 тысяч чалавек. Улады сканцэнтравалі вакол стадыёна некалькі тысяч паліцэйскіх, жандараў, пажарных і войск.

Старшыня мітынга, вядомы пісьменнік **Мальро**, спатканы бурнымі апладысментамі выкрыў хлусліўыя абвінавачанні, выстаўленыя супрэць **Тэльмана** і другіх антыфашыстаў у Германіі.

Прамова соцыялістычнага лідэра **Лонге** прарывалася выгукамі: «Адзіны фронт».

Выступленне італьянскага комуніста **Кавальеры**, нядаўна адбыўшага 7-гадовае зняволенне, зрабіла вялікае ўражанне на ўсіх прысутных.

Сакратар унітарнай канфедэрацыі працы **Ракамон** адзначыў адсутнасць прадстаўнікоў рэфармісцкай канфедэрацыі, неабходнасць ажыццяўлення адзінства профруху для барацьбы з фашызмам.

Выступленне **Кашэна** было спаткана авацыяй і спевам «Інтэрнацыянала». Кашэн указаў па неабходнасць узмацнення кампаніі ў абарону Тэльмана. Ён падкрэсліў неабходнасць неадкладных дзеянняў для вырэжэння салідарнасці са змагаючымся іспанскім пролетарыятам і над бурныя апладысменты выказаў жаль па повалу адмаўлення кіраўніцтва II Інтэрнацыянала неадкладна арганізаваць адзінства дзеянняў з Комінтэрнам.

АБВАСТРЭННЕ БАРАЦЬБЫ У ЛАГЕРЫ ЯПОНСКІХ ІМПЕРЫЯЛІСТАЎ

ШАНХАЙ, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Японскія газеты публікуюць заяўленне ваеннага міністра **Хаясі** і яго намесніка **Хасімота**, што калі ўрад не забяспечыць правядзенне рэформы японскіх органаў у Манчжоу-Го, то ён «будзе несці адказнасць» за вынікі, якія могуць узнікнуць. Барацьба настолькі абвастрылася, што камандуючы квантунскай арміяй **Ісінары**, паводле слоў агенцтва **Сімбун Рэнга**, быў вымушан параіць кабінету міністраў «улічыць рашучасць працаўнікаў рэформы.

Аднак, ваенчына спяшаецца правесці рэформу, разумеючы, што працаўнікі рыхтуюць новы націск у выглядзе стварэння «мазгавога трэста» пад назвай «нацыянальнага даследчага камітэта», які ў складзе старшыні ўрада Саіто — самога **Саіто, Такахасі** — былога міністра фінансаў, **Ямамота** і другіх — павінен стаць «звышгабінетам» для абуздання ваенна-фашысцкіх элементаў, атрымаўшых магутнае падтрымкане ў выглядзе апублікавання вядомай брашуры ваеннага міністэрства.

Адначасова пашлі размовы аб неабходнасці змены кабінета. «Тэйто-ніці-ніці» адзначае, што Генро і прыдворныя колы незадаволены прэм'ерам Окада, які поўнасцю задаволіў усе патрабаванні арміі ў пытанні аб рэформе японскіх органаў у Манчжоу-Го і не адолеў абуздаць флот, які пагражае выйсці з падчынення ў выпадку адмяжкі растаржэння вашынгтонскага пагаднення.

Окада, — піша газета, — не апраўдаў надзей і таму павінен адыйсці. Ваенныя колы, вядома, прымуць усе меры для захавання пакладзістага прэм'ера.

АНТЫФАШЫСЦКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў Ліверпулі і Манчэстэры адбыліся буйныя рабочыя антыфашысцкія дэманстрацыі. У Ліверпуле ля памяшкання, дзе выступаў лідэр фашыстаў Мослі, былі сканцэнтраваны буйныя атрады паліцыі.

Прамова Мослі ўвесь час перарывалася варожымі выгукамі.

У Манчэстэры ў антыфашысцкай дэманстрацыі прымала ўдзел 15 тысяч рабочых. На мітынгу пасля дэманстрацыі выступілі відныя комуністы Галахер і Браун, а таксама лейбарыст Персель і інш.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Як паведамляе польскае агенцтва, венгерскім прэм'ерам Гембешам, з аднаго боку, Бекам і польскім міністрам асветы Енджэевічам — з другога, падпісана польска-венгерская канвенцыя аб культурным супрацоўніцтве.

Англійскія лётчыкі Скотт і Блэк, прыляцеўшыя з Мільдэнхолла (Англія) у Дарвін (Аўстралія), пакрылі ўсю адлегласць за 2 дні 4 гадзіны 38 мінут. Да гэтага, год назад рэкорд быў пастаўлен аўстралійскім лётчыкам Ульмам, зрабіўшым пералёт з Англіі ў Аўстралію за 6 дзён 17 гадзін 45 мін.

Англійскі многаматорны аэраплан з кантрадэрамі міжнароднага конкурса па скорасны пералёт Англія — Аўстралія разбіўся ў пачатковай частцы Сінгапура, 6 чалавек забіта.

МЕНСК

Менск. Рог вуліц Энгельса і Совецкай прымае культурны выгляд. Робіцца новы брук.

КЛУБЫ МЕНСКА ДА ОКЦЯБРСКІХ СВЯТ

Клуб імя УП з'езда профсаюзаў разгарнуў падрыхтоўку да окцябрскіх свят. Драмгурток клуба рыхтуе камедыю «Тарцюф». Працуе над новым рэпертуарам і струнны гурток клуба. У палітгуртках працаюцца тэмы аб Окцябрскай рэволюцыі. Пачынаючы з 4 лістапада, у клубе будуць праводзіцца спецыяльныя вечары з паказам работы самадзейных гурткоў. Будзе праведзен таксама раённік для дзяцей.

Да Окцябрскіх свят заканчваецца капітальны рамонт рэспубліканскага Дома працасветы. На гэту мэту асігнавана каля 70.000 рублёў. Абсталёўваюцца пакоі ударніка-настаўніка і дашкольны педагагічны музей (БЕЛТА).

СТАЛІЦЫ БССР — УЗОРНЫ ВАКЗАЛ

Пры актыўнай дапамозе гарадскога совета і гаркома партыі Менскі чыгуначны вакзал ператвараецца ва ўзорны па абслугоўванню пасажыраў. Увесь будынак рамонтуецца. Пашыраецца зала для чакання, абсталёўваюцца пакоі культурнага адпачынку, чытальная зала і спецыяльны пакой маткі і дзіцяці з душам і ваннамі.

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МЕНСКА ДРОВАМІ

20 кастрычніка гартон атрымаў 27 вагонаў дроў. 21 кастрычніка паступленне дроў не было. 22 кастрычніка дастаўлена вяртучкай 30 вагонаў дроў для рабочых чыгуначнікаў.

УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЕ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Сёння ў будынку Дзяржаўнага тэатра адбудзецца ўрачыстае адкрыццё гістарычнага факультэта пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Віцэ-прэзідэнт Акадэміі Навук, дэкан факультэта акадэмік Шчэрбакоў выступіць з дакладам на тэму: «Крызіс буржуазнай гістарычнай навукі і гістарычная асвета ў СССР і БССР».

На факультэт залічана 67 чалавек сярод іх 28 комуністаў. Партыйная і комсамольская праслойка складае 85 проц. Факультэт укамплектован высокакваліфікаванымі навуковымі сіламі. Сярод іх акадэмікі Вальфсон, Нікольскі, Шчэрбакоў, прафесары Перпаў, Поташ і інш. Для чытання лекцый таксама запрошаны прэзідэнт Акадэміі навук тав. **Горын** і рад выдатных гісторыкаў Масквы і Ленінграда.

Па Саюзу і Совецкай Беларусі

„КРАСИН" ЗАКОНЧЫЎ РЭЙС

20 ТЫСЯЧ МІЛЬ ПА ТРОХ АКІЯНАХ І ДЗЕСЯТКАХ МОРАЎ

ВЛАДЗІВАСТОК 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Пасля 20 тысяч міль пераходу па трох акіянах і дзесятках моравў чырвонасцяжны ледакол «Красин» аддаў сёння ў 15 г. 40 мін. якар у бухце Залаты рог (Владзівасток). Святочна ўпры гожаныя судны, совецкія і замежныя, салютавалі герою Арктыкі флагамі і гудкамі. Морскія сілы Далёкага Усходу выслалі к месту прычалу «Красина» ганаровы караул з ударнікаў-чырвонафлотцаў. Тысячы працоўных горада прышлі вітаць калектыў красінцаў са сканчэннем рэйса.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ МТС

МАСКВА, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). Згодна рашэння Саўнаркома СССР ад 20 верасня г.г., у веснавой пасеўнай кампаніі 1935 года, у МТС і саўгасах павінна быць пабудавана 2 тысячы радыёстанцый. Нарком сувязі распрацаваў план, па якому ў МТС будзе пабудавана 1350 і ў саўгасах 650 станцый. Наркамзем і Наркомсоўгасаў закончылі размеркаванне станцый па абласцях і краях.

СТАРШЫНЯ СОВЕТА МІНІСТРАЎ МНР — У МАСКВЕ

МАСКВА, 21 кастрычніка. (БЕЛТА). 21 кастрычніка ў Маскву прыбыў старшыня совета міністраў і міністр замежных спраў Манголыскай народнай рэспублікі п. **Гендун** у суправаджэнні намесніка міністра замежных спраў МНР п. **Дугуржап** і намесніка ваеннага міністра МНР п. **Дашыэрып**.

З тым-жа поездам у Маскву прыехаў паўпрэд СССР у Манголіі — тав. **С. Н. Чуцкаеў**.

ПЕРААБСТАЛЯВАННЕ ТЭЛЕФОННАЙ СТАНЦЫІ У МАЗЫРЫ

МАЗЫР, 22 кастрычніка. (**По тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»**).

У Мазыры пераабсталёўваецца гарадская тэлефонная станцыя. Замест старых акумулятараў і абанентных апаратаў, працуючых на масцовых батарэях, устаноўлены новыя, працуючыя на цэнтральнай батарэі. Сетка абанентных нумароў павялічваецца з 200 да 300.

Мантажныя работы закончаны. Устаноўлены таксама акумулятары і камутатары; заканчваецца ўстаноўка новых абанентных апаратаў. Работа вядзецца з такім разлікам, каб станцыя магла працаваць поўным ходам да Окцябрскіх свят.

ФРАЛОЎ.

ЗІМОВЫ ПАЛЯЎНІЧЫ СЕЗОН

З 1 лістапада па БССР пачынаецца зімовы паляўнічы сезон.

НА РАДЫЁПЕРАКЛІЧЦЫ ПА ПЕРАВЫБАРАХ СОВЕТАЎ

21 кастрычніка ў кабінеце старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова адбылася ўсебеларуская радыёперакліч аб ходзе вытворчага паходу імя УП ўсесаюзнага і XI усебеларускага з'езду советаў і падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў.

На радыёперакліччы прысутнічалі тт. **Чарвякоў, Закоўсні, Кудзельна, Ляўкоў**, работнікі ЦВК і прадстаўнікі друку. У раёнах — раённыя і гарадскія выбарчыя камісіі.

Перакліччу вёў сакратар ЦВК БССР, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі тав. **Ляўкоў**.

У перакліччы выступалі: старшыня Бытчанскага сельсовета (Барысаўшчына) тав. **Раяк**, сакратар віцебскай гарадской выбарчай камісіі тав. **Фамін**, старшыня Вадлаваўскага нацыянальнага сельсовета (Ушацкі раён) тав. **Берзін**, старшыня дубровенскай гарадской выбарчай камісіі тав. **Кузняцоў**, сакратар глускага РВК тав. **Дзятлавіцкі**, старшыня магілеўскага райвыканкома тав. **Пушчын** і інш.

У заключным слове тав. Ляўкоў рэзка крытыкаваў ход падрыхтоўкі да перавыбараў советаў. Падрыхтоўка ягцэ не набыла шырокага размаху і праходзіць яўна незадавальняча. Раённыя і сельсоветскія выбарчыя камісіі ягцэ слаба разгарнулі масавую работу сярод рабочых і калгаснікаў. Цэнтральныя ўстановы, як гэта выявіў рэйд «лёгкай кавалерыі», не ўключыліся ў падрыхтоўку да перавыбараў. Белкаапсаюз, напрыклад, не ведае нават, што ён павінен зрабіць да перавыбараў.

Поспех перавыбараў вырашае арганізацыя мас вакол гэтай кампаніі. Часу асталося мала, а работы шмат. **За справу, за большэвіцкую ўпартую работу, — на гэтым закончыў сваю прамову тав. Ляўкоў.**

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПА БЕЛАРУСІ

Партканегія КПК на Беларусі паведамляе, што 27 і 28 кастрычніка г. г. у г. Менску (будынак ЦК КП(б)Б, II паверх, пакой 32) будзе засядаць тройка ПК Бел. па разгляду апеляцый на гашэнні рай- і горкамісіяй на чысткі наступных таварышоў:

27 КАСТРЫЧНІКА.

Куцэнік Х. Г. (Вярэйскі р.); Крывашэй, Каналенка (Клічаўскі р.); Невяроўскі (Аршанскі р.); Мергенс Г. К., Гурскі Т. І., Чэрнушкін І. Ц. (Талачынскі р.); Тарасаў А. Ф. (Гарадоцкі р.); Арцюменка Е. П. (Крычаўскі р.); Добышаў М. Е. (Магілеўскі р.); Крычэўцаў М. А., Метліцкі В. І. (Мазырскі р.); Кушлай І. А. (Капыльскі р.); Новасёлаў Г. П. (ст. Калодзішчы); Клімаў І. Ф., Алейнік М. П., Івашкевіч Н. Т., Онякоў А. А., Шпігун А. П., Шустэр В. А., Астахаў С. Л., Пашык І. П., Літыняў (Н. П., Кобак А. Я., (Менскі р.); Вешкоўскі І. І. (Лагойскі р.); Кудзін Н. Н. (Пухавіцкі р.); Дземідовіч Г. Н. (Слепянскі р.); Клечэўскі Е. Н. (Петрыкаўскі р.); Анцыф М. М., Дабраволскі І. П., Жабінскі І. І. (Барысаўскі р.); Верамейчык М. Г. (Лоеўскі р.); Глухоўскі Г. Ш. (Брагінскі р.); Майсеенкаў В. Ф., Повіка Ф. С., Васільеў Г. І. (Клімавіцкі р.); Кандакоў П. В. (ПКУС, Плешчаніцы); Рабікаў С. Г. (ПКУС, Менск); Карупчык А. І. (Жлобінскі р.).

28 КАСТРЫЧНІКА.

Каліш С. А., Крывашэеў Я. М., Тузаў С. А., Сердзюк І. П., Соракалетаў В. Ф. (Віцебскі р.); Касяшкоў А. А. (Чэрыкаўскі р.); Слабін Ю. А. (Асвейскі р.); Рагавіцкі А. А. (Бальшэйцкі р.); Бізюні Г. Н., Саноцкі А. П. (Гуражскі р.); Пілідзенка А. В. (Суражскі р.); Лапшэнка Г. Д., Сільчэнка Е. І., Хахлоў І. М., Гарэлікаў Г. К. (Церахаўскі р.); Камароў І. С. (Кыткаўцкі р.); Арцюменка Т. С., Іванчыкаў М. А., Ежкееў П. С. (Уваравіцкі р.); Плескі Ф. Р., Жарыч А. С., Кійко П. В. (Гомельскі р.); Прымачук С. Г. (Хойніцкі р.); Раманенка П. П. (Уваравіцкі р.); Шумайла П. І. (Сенненскі р.); Шаколіна В. І., Паўлава Е. Т. (Дрысенскі р.); Сергейчык І. П. (Ельскі р.); Нехаенко Ф. Д., Дзроцін Р. К. (Аршанскі р.); Каган А. Ф. (Магілеўскі р.); Бугаеў Н. М. (Бабруйскі р.); Будзік П. М. (Галачынскі р.); Трапер Я. Б., Якуто П. С. (Касцюковіцкі р.); Янук І. В. (Чашніцкі р.); Осіпенка П. Т. (Камарынскі р.); Жук М. А., Жук І. І. (Дрысенскі р.).

Таварышам неабходна браць з сабой адпаведныя даведкі па повалу высунутых абвінавачанняў, а таксама вогулкі масцовай партыйнай арганізацыі аб рабоце за апошні час пасля чысткі. Тыя, якія былі над судом або следствам, павінны абавязкова мець пры сабе прыгавор або заключэнне, без якога справы разглядацца не будуць.

Член партканегіі КПК на Беларусі
РЫЖЫКАЎ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

24 кастрычніка ў 19 гадзін у вялікай зале Дома партактыва адбудзецца лекцыя дырэктара гістпарта тав. **Пасса** для партыйнага, профсаюзнага і комсамольскага актыва і прапагандыстаў Менска па тэме: «Окцябр і сусветная пролетарская рэволюцыя». Пасля лекцыі — мастацкая частка.

Білеты атрымаць у Доме партактыва (пакой № 22).

ДОМ ПАРТАКТЫВА ПРЫ МЕНГАРКОМЕ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

БАЛАНС

гаспадарчых сродкаў Беларускага трэста паліграфічнай прамысловасці „БЕЛПАЛІГРАФТРЭСТ"

на 1-е студзеня 1934 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса 1933 г.

АКТЫЎ: (клад і размеркаванне сродкаў)	СУМА: На 1-1—1933 г.	На 1-1—1934 г.
I. Асноўныя сродкі		
1. Будынкі і будоўлі вытворч.	729871—98	747576—89
2. Абсталяван. сілав. устаноўкі, машыны і інструменты	1542310—81	1900988—29
3. Транспарт	15040—47	20938—00
4. Гаспадарчы інвентар	166464—10	178682—71
5. Запаснае абсталяванне	45399—31	73900—05
6. Жыллёвыя, гандлёвыя і інш. невытворч. будынкі	30839—67	24799—97
7. Іншыя	5400—00	2450—00
Усяго па I раздзелу	2535326—34	2949335—91
II. Вытворчыя запасы на складзе і ў пуці		
1. Сыравіна, асноўн. дапаможн. матэрыялы, тара	891070—32	989933—70
2. Апал	8890—63	3630—38
Усяго па II раздзелу	899960—95	993564—28
III. Нескончаная прадукцыя:		
1. Астаткі незавершан. вытворч. і паўфабрыкатаў (сваіх)	348942—93	527458—16
2. Нескончаныя капітальн. работы	1278800—42	1590224—35
Усяго па III раздзелу	1627743—35	2117682—51
IV. Таварныя запасы:		
1. Тавары і фабрыкаты (на складзе і ў пуці)	110166—60	137925—20
2. Тавары, неаплочаныя	523154—97	534372—49
3. Матэрыялы для рэалізацыі і неліквілы.	41809—28	15841—45
Усяго па IV раздзелу	675130—85	688139—14
V. Грашовыя сродкі.		
1. Разрахункавыя і асобн. рахункі ў крэдытных установах	571769—81	272578—34
2. Бягучыя рахункі ў крэд. установах	72351—40	—
3. Каса і грашовыя пераводы	13856—52	2263—35
Усяго па V раздзелу	657977—73	274841—69
VI. Разлікі		
1. Спрэзаздачныя сумы	14934—68	12857—09
2. Дэбіторы	188757—46	495753—97
3. Разлікі з бюджэтам (саюзн., рэспубл. і мясцов.)	—	14131—50
4. Выдаткі будучых гадоў	135414—83	132663—61
Усяго па VI раздзелу	339106—97	655406—17

ПРАЦЯГ АКТЫВА	СУМА: На 1-1—1933 г.	На 1-1—1934 г.
VII. Выдзеленыя сродкі:		
1. Каштоўныя паперы	7509—50	6888—85
2. Паі, акцыі і ўдзел у інш. арган.	181617—10	323921—68
3. Уклады ў крэдыт. установы НКФ па адлічэннях з прыбыткаў	1560213—04	2019609—00
4. Уклады ў спецбанк	479603—62	679908—97
Усяго па VII раздзелу	2228943—26	3030328—50
БАЛАНС	8964189—45	10709298—20
ПАСІЎ		
(Стварэнне і прызначэн. сродкаў)		
I. Унутраныя рэсурсы.		
1. Статутныя фонды	2884597—76	3893241—75
2. Мэтавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	420057—41	532285—16
б) фубр	257013—00	565645—39
в) іншыя	155151—75	158085—85
3. Рэзервы	48258—11	46303—94
4. Ізнос асноўн. фондаў па становішчу на 1.X-25 г.:		
а) вытворчага значэння:	102856—18	185588—18
Усяго па I раздзелу	3867934—21	5381150—17
II. Пазыковыя сродкі		
1. Бюджэтнае фінансаванне	—	161570—05
2. Доўгатэрміновыя крэдыты	—	822909—40
3. Кароткатэрміновыя пазыкі крэдытных устаноў	92525—00	184027—00
4. Разлікі з бюджэтам (саюзн. рэспубл. і мясцов.)	107899—85	22000—16
5. Крэдыторы	477237—82	392546—15
6. Даходы будучых гадоў	245—76	—
Усяго па II раздзелу	677908—43	1583052—76
III. Накапленні (прыбытак):		
а) папярэдняга перыяду	4418346—81	3745095—27
Усяго па III раздзелу	4418346—81	3745095—27
БАЛАНС	8964189—45	10709298—20

РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1933 г.

УБЫТКІ.	
1. Убыткі ад стыхійных нятчасцяў.	6818—90
2. Убыткі ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрмінаў даўнасці	19155—56
3. Іншыя ўбыткі і страты	194619—14
4. Убыткі мінулых год.	51833—05
УСЯГО	272426—65
Чысты прыбытак	3745095—27
УСЯГО	4017521—92

ПРЫБЫТКІ.	
1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і ад аказання паслуг. (сальдо)	3949501—25
2. Прыбытак ад паступленняў па безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрмінаў іскавой даўнасці	38561—25
3. Іншыя прыбыткі і даходы	26105—30
4. Прыбыткі мінулых год.	8354—12
УСЯГО	4017521—92

Баланс разгледжан і зацверджан справаздачнай балансавай камісіяй НКЛП БССР (пратакол № 3 ад 25-II—34 г.) і да друкавання дазволен.

За нач. САС НКЛП БССР **ГОРШТЭЙН.**

Кіраўнік Белпаліграфтрэста **БЕДЫНЕРМАН.**
Галоўны бухгалтар **ГАЛЫНКО.**

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ПРОЛЕТАРЫЙ"

Ад 5 лістапада 1934 г.

„ТРЫ ПЕСНІ АБ ЛЕНІНЕ"

Вытворчасць Міжрабпомфільма

Рэжысер **Д. ВЕРТАЎ.**

„Левін — горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і які адважна вядзе ўперад партыю па вязведаных шляхах рускага рэволюцыйнага руху".
(І СТАЛІН).

„Стойце моцна, стойце дружна, смела ўперад супроць ворага, за намі будзе перамога. Улада памешчыкаў і капіталістаў, злемленая у нас, у Расіі, будзе пераможана ва ўсім свеце" — так гаварыў Ленін і яго словы зафіксаваны ў кардіне.

ПЕСНЯ ПЕРШАЯ. У ЧОРНАЙ ТУРМЕ БЫЎ МОЙ ТВАР...

ПЕСНЯ ДРУГАЯ. МЫ ЛЮБІЛІ ЯГО...

ПЕСНЯ ТРЭЦЯЯ. У ВЯЛІКІМ КАМЕННЫМ ГОРАДЗЕ...

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!

АНОНС! ГЭТЫМІ ДНЯМІ

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Едзе замежны АТРАКЦЫЁН

ФРАНКАРДЗІ

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Мастацкі фільм ПЫШКА

Кіно „Інтэрнацыянал" — НОВАЯ ПРАГРАМА

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" — Мастацкі фільм ГЮЛЛІ Кэнцэрт Усходн. ансамбля

Кіно СПАРТАК — БЭЛА па раману Лермантава драма ў 8 частках.

26-га кастрычніка ў 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (рог вул. Энгельса і Карла Маркса),

склікаецца

НАРАДА ПРОФАКТЫВА гор. МЕНСКА.

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб удзеле профактыва ў рабоце бюро скаргаў Камісіі Совецкага Кантроля (дакладчык — ч. в. к. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР — тав. **КАМЕНЕЎ М. М.**).

На нараду павінны з'явіцца: старшыні ФЗМК, старшыні рэвізійных камісій, цехпрофарганізатары, члены дэлегацкіх груп горсовета, рабочыя кантролёры, гранадскія кантролёры, бюро скаргаў, рабкоры газеты „Рабочий", вынаходнікі-рацыяналізатары.

Рэгістрацыя пачнецца ў 6 в палов. гадз.

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ „РАБОЧИЙ".
БЮРО СКАРГАЎ УПАЎНАВ. КСК па БССР.

Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — ПЕДЗІКАЎ, ст. друкар — АНУЧЫН.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбел К—3276.